Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 97 (5771) | 27 красавіка 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Выкаранім ворагаў народу—япона-германа-трацкісцкіх шкоднікаў і шпіёнаў! Смерць здраднікам радзімы!

(З першамайскіх лозунгаў ЦК ВКП(б)

Лозунгі большэвіцкіх перамог

Сёння*) мы публікуем лозунгі Цэнтральнага Камітэта партыі к 1 Мая 1937 года. Надыходзіць вялікае свята — баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята. Першы дзень мая стаў сімвалам надзей усяго прыгнечанага і абязадоленага капіталізмам чалавецтва, сімвалам яднання ўсіх пролетарскіх сіл, сімвалам перамогі соцыялізма ў СССР.

У гэты дзень ва ўсіх краінах свету высока ўзаўецца непераможны чырвоны сцяг, на якім вогненымі літарамі начэртана: — Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! Станавіцеся пад сцяг Комуністычнага Інтэрнацыянала!

Поўны глыбокага сэнсу і пачуцця, гэты баявы пролетарскі лозунг, асвячоны дзесяцігоддзямі разлютаванай барацьбы, гучыць у нашы дні з асобнай сілай і запалам. У рашаючай схватцы зышліся два светы — свет капіталізма і свет соцыялізма. Барацьба разгортваецца з незвычайнай астрынёй. Капіталісты і самае гнуснае парадженне капітала — фашызм —ідуць на развязванне вайны, рыхтуюць паход супроць бацькаўшчыны працоўных усяго свету — СССР. Фашызм пагражае ўзарваць усё чалавецтва ў вір імперыялістычнай вайны. Артылерыйскія залпы на франтах Іспаніі, быццам бліскавіцы надыходзячай грозы, прарэзваюць небасхіл. Фашысцкі тэрор сваёй раз'юшанасцю і зверствам перавышае самыя змрочныя гады сярэдневякоўя.

Працоўныя Гэрманіі, Італіі, Іспаніі, Абісініі пазналі на сваім вопыце, што такое фашызм.

«Фашызм — гэта тэрарыстычная палітыка капіталістаў і памешчыкаў супроць рабочых і сялян. Фашызм — гэта захватніцкая вайна. Фашызм — гэта нацкоўванне народаў адзін на аднаго. Мабілізуем сілы на барацьбу з фашызмам!»

Пад гэтым лозунгам згуртоўваюцца працоўныя ўсяго свету, усё культурнае і перадавое чалавецтва. Шырыцца і мацнее народны фронт барацьбы з фашызмам і вайной. За мір, за дэмакратычныя свабоды, супроць фашызма — вось што напісана на сцягах народнага фронта. Усе, у каго б'ецца ў грудзі чэснае серца, усе, каму дорагі інтарэсы дэмакратыі, з любоўю і захапленнем сочаць за тытанічнай барацьбой іспанскіх рабочых з фашысцкімі захватчыкамі. Мы з вамі, таварышы!

«Брацкае прывітанне рабочым Іспаніі, якія вядуць гераічную барацьбу супроць фашызма і замежных інтэрвентаў. Няхай жыве народны фронт у Іспаніі! Далоў яўных і скрытых ворагаў народнага фронта!»

Нашы мысліі пачуцці з працоўнымі Германіі, якія стогнуць пад ярмом фашысцкага рэжыма. Наша першамайскае прывітанне мужнаму таварышу Тэльману. Фашысцкія засценкі не зломяць волю пролетарскіх рэволюцыянераў. Жыве і змагаецца комуністычная партыя Германіі!

У час, калі ўвесь капіталістычны свет раздзіраецца супярэчнасцямі, у час, калі фашызм рыхтуе новую бойню, погляды ўсіх працоўных і прыгнечаных звернуты да нашай краіны. Магутная крэпасцю высіцца яна сярод шалеючага фашысцкага мора. Совецкая краіна ў дваццаты раз адзначае 1 Мая свабоднай і шчаслівай! Наварце яе граніц стаіць магутная Чырвоная Армія—любімца народу, верны вартавы і аплот міру.

1 Мая 1937 года мы сустракаем у абстаноўцы вялікага павароту ў палітычным жыцці краіны. Сталінская Канстытуцыя падвяла вынік пройдзенага шляху і запісала сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма. Да кіравання дзяржавай узнімаюцца новыя слаі працоўных. Новая сістэма выбараў азначае далейшы росквіт совецкай дэмакратыі, расшырэнне базы дыктатуры рабочага класа. Новая Канстытуцыя высока ўзнімае званне совецкага грамадзяніна, забяспечваючы яму права на працу, права на адпачынак, права на асвету і т. д. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна рабочы клас і сялянства ідуць наперад, да заваявання комунізма.

«Няхай жыве новая Канстытуцыя СССР, Канстытуцыя перамогшага соцыялізма і сапраўднага дэмакратызма!»

Да першамайскіх свят наша краіна прыходзіць з вялікімі гаспадарчымі поспехамі. Другі пяцігадовы план вытворчасці па прамысловасці СССР у цэлым выкананы на 9 месяцаў раней тэрміну—да 1 красавіка 1937 года. Наша соцыялістычная прамысловасць, стаханаўскі рух зноў паказалі сваю сілу, свае магчымасці. Датэрміновае выкананне пяцігодак становіцца слаўнай традыцыяй рабочых, работніц і кіраўнікоў соцыялістычнай прамысловасці.

Другі пяцігадовы план па перавозках чыгуначнага транспарта выкананы да 1 студзеня 1937 года з перавыкананнем на 7,7 проц., г. зн. больш чым на год раней. Такім чынам, чыгуначны транспарт выканаў сваю пяцігодку ў чатыры гады. Соцыялістычны транспарт упэўнена ідзе ў гару!

Калгаснікі і калгаспіцы, аграномы, рабочыя і кіраўнікі соўгасаў таксама паказваюць пуды працоўнага гераізма. На 20 красавіка засеяна на 10,5 мільёна гектараў больш, чым у мінулым годзе. Саюз рабочых і сялян — аснова совецкай улады — моцны і непарушны!

Наша краіна ўступіла ў такую паласу свайго развіцця, калі перавагі соцыялістычнага ладу будуць сказвацца з кожным днём усё мацней і мацней. Але для таго, каб іх выкарыстаць, трэба яшчэ больш умацаваць магутнасць соцыялістычнай дзяржавы, рашуча разгарнуць крытыку і самакрытыку нашых недахопаў, павысіць пільнасць да ворага, умець распазнаваць ворага, якой-бы маскай ён ні прыкрываўся.

Надыходзяць выбары ў Советы, калі палітычная актыўнасць мас павысіцца яшчэ больш. Уменне кіраваць становіцца сапраўдным майстэрствам, масы будуць правяраць кіраўнікоў на канкрэтных справах, адхіляючы бюракратаў і бяздзельнікаў.

«Сувязь з масамі, узмацненне гэтай сувязі, гатоўнасць прыслухоўвацца да голасу мас, — вось у чым сіла і непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва» (Сталін).

Найлыбейшая сувязь з масамі з'яўляецца добрым сродкам барацьбы з ворагамі. Яна дапамагае быстра знаходзіць і знішчаць ворагаў. Разам з масамі, на чале мас наша партыя павядзе працоўных да новых перамог.

Мы жывем у капіталістычным акружэнні. Гэта разуменне вельмі рэальнае. Фашызм засылае да нас сваіх лазутчыкаў, тэрарыстаў і шпіёнаў, у першую чаргу з ліку трацкістаў. Яны рыхтуюць здрадніцкі ўдар у спіну рэволюцыі, ідучы на самыя гнусныя спосабы барацьбы з совецкай уладай. Ворагам у нас няма літасці.

«Выкаранім ворагаў народу, япона-германа-трацкісцкіх шкоднікаў і шпіёнаў! Смерць здраднікам радзімы!».

Лозунгі Цэнтральнага Камітэта партыі к 1 Мая мабілізуюць усіх працоўных на барацьбу за далейшыя перамогі соцыялізма. Яны выражаюць веліч нашай эпохі, таржаство Сталінскай Канстытуцыі. Яны заклікаюць да ўзмацнення рэволюцыйнай пільнасці, да ліквідацыі палітычнай бестурботнасці, да напружання сіл, энергіі працоўных для новых баёў і новых перамог комунізма.

Няхай-жа ўсё вышэй узнімаецца сцяг комунізма, сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!

Няхай жыве 1 Мая — свята юнасці соцыялізма, баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

(„Правда")

*) Гл. «Звязду» за 26 красавіка.



КАНАЛ МАСКВА—ВОЛГА. НА ЗДЫМКУ: кацер у камеры шлюза, напоўненага вадой.

Фото С. Кіслова (СФ).

АБ ДНІ БОЛЬШЭВІЦКАГА ДРУКУ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Паварот у палітычным жыцці краіны, які адбываецца на аснове Сталінскай Канстытуцыі Саюза ССР, патрабуе ад усіх работнікаў большэвіцкага друку і партыйных арганізацый карэннай перабудовы работы.

5 мая — Дзень большэвіцкага друку і 25-годдзя «Правды» — усе акруговыя, гарадскія, раённыя камітэты КП(б)Б і рэдакцыі газет павінны правесці пад знакам барацьбы за выкананне рашэнняў апошняга Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна ў яго дакладзе і заключным слове.

Бюро ЦК КП(б)Б абавязвае акруговыя, гарадскія і раённыя камітэты КП(б)Б усе праводзімыя ў Дзень друку арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы забяспечыць партыйным кіраўніцтвам, дабіваючыся ўсебаковага папулярэння і ўмацавання сувязей газет з масамі, прыцягнення да супрацоўніцтва ў газетах новых аўтарскіх кадраў, узмацнення партыйнага кіраўніцтва друкам і аднаўлення ва ўсіх партыйных работнікаў густу да большэвіцкай прапаганды і друкаванага слова.

Адзначаючы Дзень друку, неабходна паказаць масам выключную ролю таварышоў Леніна і Сталіна, як правадыроў і арганізатараў большэвіцкай партыі, асабіста штодзённа кіраваўшых дзейнасцю друку, вучыўшых яго непрымірымай барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа, выхоўваўшых кадры большэвіцкага друку, арганізаваўшых вакол партыі праз друк шматмільённыя масы рабочых і сялян.

Растлумачыць масам і актыву друку, што дапаўненне старога лозунга аб авалоданні тэхнікай новым лозунгам «Аб палітычным выхаванні кадраў, аб авалоданні большэвізмам і ліквідацыі нашай палітычнай даверлівасці» — патрабуе ад усіх работнікаў друку большэвіцкага правядзення крытыкі і самакрытыкі, не гледзячы на асобы, і штодзённага кіраўніцтва і накіравання работы нашага друку партыйнымі арганізацыямі.

У азнаменаванне Дня большэвіцкага друку і 25-годдзя газеты «Правда» Бюро ЦК КП(б)Б абавязвае гарадскія, акруговыя, раённыя камітэты КП(б)Б і рэдакцыі газет правесці наступныя мерапрыемствы:

1. У гарадах: Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве 5-га мая правесці агульнагарадскія сходы партыйнага актыва, рабкораў, чытачоў газет, стаханаўцаў і працоўнай інтэлігенцыі. На сходах заслухаць і абмеркаваць даклад «Дваццаціпяцігодзе «Правды» і задачы большэвіцкага друку» (дакладчыкамі павінны быць першыя сакратары партарганізацый); рэдактары газет робяць сэдаклады: «Работа ў газеце з пісьмамі працоўных і аўтарскія кадры ў газеце».

2. У гарадах: Бабруйску, Барысаве, Оршы, Рэчыцы і акруговых цэнтрах з 5-га па 12-е мая правесці сходы партыйнага актыва, рэдактараў шматтыражных газет, членаў рэдкалегій насценных газет, актыва рабселькораў і чытачоў з дакладам сакратара АК, ГК і РК КП(б)Б на тую-ж тэму, што і ў гарадах Менска і іншых. Рэдактары гарадскіх і акруговых газет робяць справаздачу аб рабоце газет за 1936 год і да Дня друку.

3. У астатніх раёнах Беларусі правесці з 5-га па 10-е мая раённыя сходы партыйнага актыва, чытачоў, рабселькораў, стаханаўцаў, рэдактараў насценных і шматтыражных газет, на якіх заслухаць даклад сакратара райкома КП(б)Б аб 25-годдзі «Правды» і задачах большэвіцкага друку і справаздачу рэдактара лепшай шматтыражнай або насценнай газеты.

4. Абавязаць сакратароў гаркомаў, акругкомаў, райкомаў і рэдактараў газет правесці вынікі правядзення сходаў у азнаменаванні Дня друку і 25-гадовага юбілея «Правды», вывады абмеркаваць на бюро ГК, АК і РК КП(б)Б і вынесці адпаведныя рашэнні.

Аб узнагароджанні камандзіраў і чырвонаармейцаў-пагранічнікаў Ордэнамі СССР

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР **пастанаўляе:**

За доблесць і геройства, праяўленыя пры абароне дзяржаўных граніц СССР, узнагародзіць:

Ордэнам **Чырвонага сцяга**

1. **Меньшыніна К. Т.**—камандзіра аддзялення.
2. **Тімафеева В. І.**—чырвонаармейца.
3. **Крукава Н. С.**—чырвонаармейца.

Ордэнам **Чырвонай звязды**

Галавіна К. П.—старшага памочніка начальніка аддзялення.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.

Аб назначэнні тав. Рыжыкава І. І. Народным Камісарам лясной прамысловасці БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. **Рыжыкава Іосіфа Іванавіча** Народным Камісарам лясной прамысловасці БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

26 красавіка 1937 г.
г. Менск.

Аб назначэнні тав. НІЗАЎЦОВА Н. Ф. Народным Камісарам земляробства БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. **Нізаўцова Нікалая Федосеевіча** Народным Камісарам земляробства БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

26 красавіка 1937 г.
г. Менск.

Аб вызваленні т. БЕНЕКА К. Ф. ад абавязкаў Народнага Камісара земляробства БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Вызваліць тав. **Бенека Казіміра Францавіча** ад абавязкаў Народнага Камісара земляробства БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

26 красавіка 1937 г.
г. Менск.

НОВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР назначыў т. Серафімава В. С. — першым намеснікам народнага камісара асветы БССР; т. Талэуша П. Я. — намеснікам начальніка кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчоту БССР па пытаннях ураджайнасці; т. Ткачэвіча І. М. — начальнікам кіраўніцтва па справах мастацтваў пры СНК БССР; т. Пасюкевіча П. О. — намеснікам начальніка кіраўніцтва па справах мастацтваў пры СНК БССР. Тав. Нейштат Э. Л. вызвален ад абавязкаў намесніка народнага камісара аховы здароўя БССР у сувязі з пераходам на іншую работу.

АБ ПЕРАТВАРЭННІ ТАК ЗВАНЫХ УЗОРНЫХ І БАЗАВЫХ ШКОЛ У НАРМАЛЬНЫЯ ШКОЛЫ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Совет Народных Камісараў БССР адзначае, што практыка выдзялення ў сістэме НК Асветы, так званых, «узорных», «базавых» і аналагічных ім школ, якія знаходзяцца ў асобным становішчы адносна ўсёй масы звычайных нармальных школ, сябе не апраўдвае і прыводзіць на справе да таго, што НК Асветы забывае сваю асноўную задачу — ўздым на належную вышыню вучэбнай і выхаваўчай работы ва ўсіх школах.

Выдзяленне, так званых, «узорных» школ пры ўмове, што значная частка гэтых школ на самай справе далёка не з'яўляецца ні ўзорнымі, ні базавымі па пастаноўцы вучэбна-выхаваўчай справы ў іх, прывяло да ўстанаўлення ў гэтых школах асобных патрабаванняў да падбору вучняў па іх разумовых здольнасцях, да ўстанаўлення, у сувязі з гэтым, павышаных вучэбных патрабаванняў, да выключэння з узорных школ вучняў, якія не задавальняюць гэтых павышаных патрабаванняў. Гэтыя факты Соўнарком БССР не можа не разглядаць як спробу з боку НК Асветы, загалчыкаў раёнаў, дырэктароў школ працягнуць кантрабандай асуджаныя партыяй педагагічныя скажэнні ў школе.

На падставе вышэйуказанага Совет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць НК Асветы ператварыць узорныя і аналагічныя ім па тыпу школы ў звычайныя нармальныя школы, закончыўшы гэтую работу да 10 мая 1937 года.

2. Указаць НК Асветы, што яго галоўнай задачай з'яўляецца ўздым па належную вышыню вучэбна-выхаваўчай работы ва ўсіх, у тым ліку і ў былых «узорных» і «базавых» школах.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік справаў Совета Народных Камісараў БССР
І. ЛУК'ЯНЧЫК.

27237 тыс. ГЕКТАРАЎ ЯРАВЫХ ЗАСЕЯНА ПА СССР

Зводка Наркамзема СССР, Наркомсоўгасаў і Наркамхарчпрома аб ходзе сяўбы яравых на 20 красавіка 1937 года

(у тысячах гектараў)

Рэспублікі, краі і вобласці	Усяго засеяна: Тыс. га	Проц. да плана	Калгасамі	У тым ліку засеяна: У тым ліку МТС	Адпаведнымі гасп.	Соўгасамі	У тым ліку соўгасамі: НКСоўгасаў	НКЗ СССР	НК Харчпрома
РСФСР	14287	22	12850	11799	9	1428	931	150	200
Украінская ССР	8895	61	8018	7419	7	870	498	61	195
Беларуская ССР	542	22	505	375	14	23	14	4	1
Азербайджанская ССР	152	33	134	90	6	12	5	4	—
Грузінская ССР	244	33	194	96	45	5	—	1	—
Армянская ССР	114	36	105	56	8	1	—	1	—
Туркменская ССР	220	79	214	212	1	5	3	2	—
Узбекская ССР	1056	56	972	886	7	77	26	40	—
Таджыкская ССР	320	55	308	124	2	10	3	7	—
Казахская ССР	1009	19	934	676	2	73	50	18	5
Кіргізская ССР	398	48	361	247	4	33	18	9	6
Краі, вобласці і аўтаномныя рэспублікі РСФСР:									
Азова-Чорваморскі край	3577	66	3061	2930	—	516	329	39	56
Далёкаўсходні край	49	5	47	43	—	2	1	—	1
Орджанікідзеўскі край	993	61	864	809	2	127	97	11	7
Варонежская вобл.	1607	40	1449	1413	2	156	86	24	46
Горкаўская вобл.	117	9	114	93	—	3	1	—	—
Заходняя вобл.	416	17	410	135	—	6	2	2	2
Іванаўская вобл.	56	7	53	36	—	3	1	1	—
Калінінская вобл.	237	17	236	178	—	1	—	—	1
Кіраўская вобл.	18	1	18	11	—	—	—	—	—
Куйбышэўская вобл.	484	13	441	422	—	43	32	6	5
Курская вобл.	1090	41	1038	1034	1	51	9	7	35
Ленінградская вобл.	27	2	27	19	—	—	—	—	—
Маскоўская вобл.	673	23	626	363	—	47	6	7	25
Оранбургская вобл.	249	9	226	226	—	23	18	4	1
Саратаўская вобл.	859	32	739	739	—	119	90	23	6
Паўночная вобл.	24	3	24	14	—	—	—	—	—
Сталінградская вобласць	2159	71	1988	1982	—	171	163	1	7
Чэлябінская вобл.	36	1	27	27	—	9	7	—	—
Яраслаўская вобл.	51	6	50	30	—	1	—	—	—
Татарская АССР	245	12	240	210	—	5	2	1	—
Башкірская АССР	99	4	94	83	—	5	5	—	—
Дагестанская АССР	88	31	73	57	4	11	10	1	—
Кабардзіна-Балкарская АССР	77	33	69	57	—	8	3	4	1
Калмыцкая АССР	79	56	63	54	—	16	12	4	—
Крымская АССР	208	54	145	145	—	63	24	11	5
Марыйская АССР	8	3	8	6	—	—	—	—	—
Мардоўская АССР	105	12	104	104	—	1	1	—	—
Немцаў Паволж'я АССР	528	50	493	492	—	35	30	2	—
Паўночна-Осецінская АССР	13	13	12	11	—	1	—	—	—
Чэчэна-Інгушская АССР	42	16	38	27	—	4	2	1	1
Чувашская АССР	74	18	73	49	—	1	—	—	1
Вобласці і аўтаномныя рэспублікі УССР:									
Вінніцкая вобл.	1185	66	1154	1064	2	29	2	—	27
Днепрапетроўская вобласць	1560	63	1431	1382	1	128	104	12	12
Данецкая вобл.	1216	68	919	914	—	297	163	2	4
Кіеўская вобл.	1288	57	1230	1085	2	56	5	4	47
Одэская вобл.	1265	60	1076	1049	—	189	149	15	19
Харкаўская вобл.	1691	66	1535	1382	1	155	72	8	75
Чэрнігаўская вобл.	527	38	513	397	1	13	3	2	8
Малдаўская АССР	163	56	160	146	—	3	—	—	2
Вобласці Казахскай ССР:									
Акцюбінская вобл.	125	—	123	60	—	2	2	—	—
Алма-Ацінская вобласць	140	—	130	87	1	9	4	5	—
Заходне-Казахстанская вобласць	343	—	315	223	—	28	22	—	—
Кустанайская вобл.	52	—	51	32	—	1	1	—	—
Паўночна-Казахстанская вобласць	1	—	1	—	—	—	—	—	—
Паўднёва-Казахстанская вобласць	348	—	314	274	1	33	21	7	5
Аўтан. рэспубліка Узбекскай ССР:									
Кара-Калпакская АССР	12	—	12	—	—	—	—	—	—
Аўтан. рэспублікі Грузінскай ССР:									
Аджарская АССР	2	—	1	—	1	—	—	—	—
Абхазская АССР	6	—	4	—	2	—	—	—	—
Аўтан. рэспубліка Азербайджанскай ССР:									
Нахічаванская АССР	12	—	11	—	1	—	—	—	—
Усяго па СССР	27237	29	24595	21980	105	2537	1648	297	408
% да плана:	—	—	29	30	18	27	30	37	50
Было на 15/IV-1937 г.	19711	21	17673	15997	70	1968	1220	215	304
Было на 20/IV-1936 г.	16642	18	14312	12603	219	2111	1044	235	353

ЗАЎВАГА: Наступныя краі, вобласці і аўтаномныя рэспублікі яшчэ не пачалі сеяць: Заходне-Сібірскі і Краснаярскі краі; Усходне-Сібірская, Омская, Свердлоўская вобласці; Бурат-Мангольская, Карэльская, Комі, Удмурцкая, Якуцкая АССР; Усходне-Казахстанская і Карагандзінская вобласці Казахскай ССР.

Па соўгасах НКХарчпрома не размеркавана па абласцях УССР 1064 гектары. Па соўгасах НКЗ СССР не размеркавана па абласцях УССР 18122 гектары. Па абласцях Казахскай ССР не размеркаваны 6382 гектары.

БЫЦЬ З МАСАМІ, НА ЧАЛЕ МАС!

СХОД АКТЫВА БАРЫСАЎСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Два дні (22 і 23 красавіка) абмяркоўваў актыў Барысаўскай партарганізацыі даклад сакратара райкома тав. Майсеева аб ходзе справаздачна-выбарчых сходаў і становішчы арганізацыі.

Гэта быў не звычайны сход, прысвечаны пытанням бягучай работы. Буйнейшыя недахопы і правалы на радзе важнейшых участкаў работы арганізацыі, зусім недвальняючае становішча крытыкі і самакрытыкі, — вось што выклікала неабходнасць склікання схода.

Даклад тав Майсеева не задаволіў удзельнікаў схода. Ды і сам ён, асабліва пасля выступлення сакратара ЦК КП(б)Б тав. Валковіча, які прымаў удзел у рабоце схода, выказаў у заключным слове расчараванне сваім дакладам. Але і ад гэтага запаздалага поўпрызнання веяла неразуменнем кіраўнікамі Барысаўскай партарганізацыі асаблівасцей надзвычайна напружанага становішча арганізацыі, неразуменнем задач, якія выцякаюць з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б).

У спрэчках высветлілася, што бюро раённага камітэта КП(б)Б і асабіста сакратары РК тт. Майсееў і Лысак не толькі не ўначаралілі той, яшчэ далёка не дастатковай крытыкі і самакрытыкі, якая разгарнулася на справаздачна-выбарчых сходах, а наадварот, імкнуцца не вглядзіць, падрэгуляваць. Яны былі глухімі і да шматлікіх сігналаў, якія паступалі ад радавых комуністаў, ад рабочых і калгаснікаў аб парушэннях рэволюцыйнай законнасці, аб дзеяннях класавага ворага.

Другі сакратар РК тав. Лысак, які выступіў з пакаянай прамовай, паставіў справу так, быццам РК меў толькі ўказанні зверху, а крытыкі знізу не было. Трапную рэпліку з месца аб тым, што райком не прыслухоўваўся да крытыкі, тав. Лысак абышоў маўчаннем. Гаворачы наконт указанняў зверху, тав. Лысак заявіў, што РК у радзе выпадкаў не выконваў дырэктыў ЦК, бо сакратар РК тав. Майсееў праяўляе верхагляддзкія адносіны да ЦК.

І на справе атрымалася такім чынам, што бюро РК варылася ва ўласным саку і «пад умелым і цвёрдым кіраўніцтвам тав. Майсеева» (як яго велічалі да апошняга часу розных народ старанныя падхалімы) праглядзела буйнейшыя прарывы ў раёне.

На шклозаводзе доўгі час вораг беспакарана і давоўі нахабна праводзіў падрыўную работу. Тут, як і на радзе іншых прадпрыемстваў горада, няма і элементуль неабходнай работы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, мабілізацыі мас рабочых на барацьбу з усялякімі шкодніцкімі падкопамі ворагаў.

Веснавая сяўба па раёну ідзе выключна дрэнна. Трактарны парк працуе з вялікімі перабоямі. У 1935 годзе Барысаўскі раён праславіўся як «перадавік сяўбы». Аказалася, што перадавое месца было ім атрымана ў выніку бяспрыкладнага вочкаўціцельства. Калі ў раёне аставалася незасеяным авыш 3 тысяч га, кіраўнікі раёна (Майсееў, Баранчык) рапартавалі «аб паспяховым завяршэнні сяўбы». У 1937 годзе кіраўнікі раёна тахарнуліся ў іншы бок—самаўхіліліся ад кіраўніцтва сяўбой.

У Белыніцкім сельсавеце, карыстаючыся правалам палітычнай работы і гаспадарчых мерапрыемстваў, дзейнічаюць варожыя элементы.

У раёне выключна запушчана агітацыйна-масавая работа і антырэлігійная прапаганда. Гэта не прамінулі скарыстаць для сваіх мэт розныя варожыя элементы.

У інтэрнатах, асабліва ў так званых «халасцяцкіх інтэрнатах», квітнее п'янства. У чаду гарэлачных парое дзейнічаюць брудныя лапы агентаў замежных разведак.

У некаторых калгасах раёна шмыгаюць розныя сектанты, якія менш за ўсё займаюцца «божаскімі справамі», а даволі адкрыта апрацоўваюць некаторыя групы насельніцтва на свой бок, як актыў для прадстаячых выбараў у органы Саветаў.

Няма патрэбы прыводзіць іншыя прыклады гаспадарчых і палітычных правалаў у раёне. Бюро Барысаўскага РК і сакратарам РК тт. Майсееву і Лысаку добра вядомы гэтыя і шмат іншых прыкладаў. Аб іх таксама падрабязна гаварылі і на актыве. Але бюро РК займаецца толькі бесстароннай павярхоўнай рэгістрацыяй фактаў.

Бюро РК працавала адасоблена ад арганізацыі. Не гаворачы ўжо аб тым, што радавым комуністам доступ да сакратароў РК надзвычайна цяжкі, але і з актывам яны рэдка калі сустракаюцца.

У Барысаўскай арганізацыі ёсць здольныя, моцныя большэвікі-актывісты, з якімі бюро РК магло сістэматычна раіцца, абапірацца на іх у сваёй рабоце. Але члены бюро РК «сами с усами» і працавалі так, каб «не чыносіць смецце з хаты». Ці жадалі гэтага, ці не жадалі сакратары РК тт. Майсееў і Лысак, але атрымалася так, што яны фактычна скрывалі ад арганізацыі буйнейшыя гаспадарча-палітычныя прарывы ў раёне.

Крытыка і самакрытыка ў Барысаўскай арганізацыі яшчэ толькі пачынае разгортвацца, прычым ідзе яна покуль-што са скрынам і часамі з аглядкай. Але і гэтую крытыку кіраўнікі арганізацыі ўспрымаюць нездарова. Другі сакратар РК тав. Лысак перад тварам вывіўшыхся недахопаў і памылак у рабоце РК ужо ахопіў панікай і пачынае прызнаваць існуючыя і неіснуючыя недахопы ў сваёй рабоце. Першы-ж сакратар РК тав. Майсееў нават на сходзе актыва выказаў свае барскія адносіны да крытыкі. Гаворачы зусім правільна аб асобных памылках і недахопах газеты «Звязда», ён чамусьці не палічыў патрэбным па-большэвіцку раскрытыкаваць свае антыпартыйныя паводзіны ў адносінах неадпаразовых і зусім правільных сігналаў «Звязды» аб прарывах у Барысаўскай арганізацыі.

На сходзе актыва высветлілася, што ў бюро РК не было дружнай работы. Асобныя прамоўцы сцвярджалі, што ў бюро РК ёсць элементы групаўшчыны і сямейственасць. Але сход актыва, як гэта паказалі спрэчкі, усё-ж не ўскрыў да канца прычын, якія выклікалі памылкі і буйнейшыя недахопы ў рабоце РК.

Аднак з усёй відавочнасцю зразумела, што бюро Барысаўскага РК, у прыватнасці сакратар РК т. Майсееў не ўначаралілі кіраўніцтва палітычным жыццём раёна. Дапушчаны кіраўнікамі раёна разрыў паміж палітычнай і гаспадарчай работай стварыў буйнейшыя прарывы і правалы ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы і на іншых участках.

Раённая партыйная канферэнцыя, якая абярэцца ў бліжэйшы час, павінна будзе ўзяць пад моцны агонь крытыкі і самакрытыкі работу раённага камітэта і вырашыць пытанне, ці здольна сучаснае яго кіраўніцтва, у прыватнасці сакратары РК тт. Майсееў і Лысак, па-большэвіцку выправіць дапушчаныя імі памылкі, узняць работу партарганізацыі і палітычную работу ў масах на ўзровень тых задач, якія пастаўлены ў рашэннях Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннях таварыша Сталіна.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.

ПАРТСХОДЫ НА ГОМСЕЛЬМАШЫ

Упершыню за 7 год на буйнейшым заводзе Гомеля — Гомсельмашы разгарнулася такая небывалая актыўнасць.

Агульны справаздачна-выбарчы сход прызнаў работу парткома нездавальняючай. Гэта стала зваль нечаканым не толькі для парткома, але і для гаркома. Партыйная арганізацыя Гомсельмаша, яе сакратар парткома тав. Кацман лічыліся не на апошнім ліку. Пад шыльдай «сістэматычнага выканання промфінплана» хаваліся буйнейшыя палітычныя прарывы ў партарганізацыі. Гаркам быў адарван ад такога буйнейшага гіганта і не кіраваў яго работай.

У спрэчках па дакладу парткома выказаліся 44 аратары з 63 запісаўшыхся. Але гэта было толькі пачаткам разгортвання актыўнасці.

Што паказаў сход?

Партком не змагаўся супроць падхалімства і ўгодніцтва. Сам дакладчык — сакратар парткома Кацман меў такую-ж хваробу.

Гэта прывяло да таго, што на заводзе не рэагавалі на вельмі сур'ёзныя сігналы заводскага друку аб дзеяннях ворагаў, запіскалі самакрытыку. У шматтыражцы да апошніх месяцаў не было вострай большэвіцкай крытыкі не гледзячы на асобы.

Але нельга сказаць, што ўсе зразумелі неабходнасць крытыкі і самакрытыкі. Гэта можна было бачыць з некаторых выступленняў, якія насілі падхалімскі характар у адносінах да дырэктара ці тэхнічнага дырэктара. Некаторыя проста не ведалі мер хвальбы, заяўляючы: «Іван Паўлавіч зрабіў рэволюцыю ў нас у тэхніцы» Гэта ў той час, калі т. Бідны — тэхнічны дырэктар — стаў апалітычным чалавекам, адарваўся ад партыйнай работы.

Палітычная бяскляпотнасць прывяла да таго, што партарганізацыя была засмечана класава-чужымі элементам. У парткоме ў свой час працавала намеснікам сакратара парткома шпіёнка замежнай разведкі Малеўская. Ускрыцце іх пры праверцы і абмену партыйных дакументаў праходзіла з вялікай патугай. Цэлы рад фактаў аварый і пажараў прахоўзіў мімо парткома. Іх расследаванне даручалася другарадным людзям, уключалася ў чыста тэхнічныя рамкі.

Многія комуністы не былі ахоплены партыйнай вучобай. Партком недастаткова праяраў работу гуртко? і не дапамагаў комуністам ва ўзняцці іх ідэйнага выхавання.

З 36 кандыдатаў, выстаўленых для тайнага галасавання, у спісе было пакіну та толькі 9.

Кандыдатура сакратара парткома тав. Кацмана была адвезена са спісу. Гэта як снег на галаву было для многіх комуністаў. Сакратар гаркома тав. Стакун быў некалькі раз на сходзе, выступаў і не сказаў ні слова аб тым, што Кацман не можа далей аставацца на рабоце. Не гаварыў ён ні аб якіх кампраметуючых матэрыялах аб Кацмане.

А калі пачалі абмяркоўваць кандыдатуру тав. Кацмана, прысутнічаючы на сходзе інструктар гаркома тав. Брыкаў заклаў рад сур'ёзных пытанняў Кацману, якія настаражылі аўдыторыю. Аказваецца, ў гаркоме меліся кампраметуючыя матэрыялы супроць Кацмана, але іх не правяралі, хоць аб іх гаварылі даўно.

У партком абрана 7 чалавек, з якіх былых членаў парткома толькі 3 чалавекі. Сакратаром парткома абран тав. Станкевіч.

П. КАЛАМІЕЦ.

3 мая—партыйная канферэнцыя Сталінскага раёна

Партыйная канферэнцыя Сталінскага раёна гор. Менска адкрываецца 3 мая, у 6 гадзін вечара, у памяшканні Дома партактыва (вялікая зала).

Парадак дня: 1) Справаздача райкома (дакладчык т. Літвін); 2) справаздача рэвізійнай камісіі (дакладчык т. Акімаў); 3) выбары райкома; 4) выбары рэвізійнай камісіі; 5) выбары дэлегатаў на гарадскую партканферэнцыю.

Мандаты выдаюцца ў памяшканні Сталінскага РК КП(б)Б (Чырвонаармейская, 16, пакоі 24) да 29 красавіка ўключна.

Сакратар Сталінскага РК КП(б)Б гор. Менска Літвін.

За рубяжом

НА МАДРЫДСКІМ ФРОНЦЕ. НА ЗДЫМКУ: байцы рэспубліканскіх войск на баявым посту ў акопах. (СФ).

ЛІКВІДАЦЫЯ КАМІТЭТА АБАРОНЫ МАДРЫДА

МАДРЫД, 25 красавіка. (БЕЛТА). Дэкретам іспанскага ўрада распушчан камітэт абароны Мадрыда. Гарадзянскія функцыі апошняга пераходзяць да Мадрыдскага муніцыпалітэта (гарадскога самакіраўніцтва). Ваенныя функцыі пераходзяць да штаба цэнтральнага фронта на чале з генералам Міяха.

Усе газеты прысвячаюць артыкулы генералу Міяха, указваючы, што ён бліскуча завяршыў найскладанейшую задачу кіравання абаронай Мадрыда ў самыя цяжкія для сталіцы дні.

Мэрам горада Мадрыда выбран сацыяліст Рафаэль Энча дэ ля Плата.

Ліквідацыя камітэта абароны, аварот да нармальных форм грамадзянскага кіраўніцтва аказаліся магчымымі толькі таму, што абароназдольнасць Мадрыда зараз непамерна ўзрасла ў параўнанні з мінулым. Няма неабходнасці ў захаванні надзвычайных органаў грамадзянскага кіраўніцтва.

Камітэт абароны адыграў выключную ролю ў справе ператварэння сталіцы ў непрыступную крэпасць. У сваёй рабоце ён абапіраўся на шырокія масы працоўнага насельніцтва Мадрыда.

Орган компартыі «Мундо Обрэро» піша. «Насельніцтва Мадрыда, усе іспанцы будуць заўсёды з удзячнасцю ўспамінаць работу камітэта ў самыя цяжкія моманты, якія калі-небудзь перажывала сталіца рэспублікі».

ФАШЫСЦКІ НАЛЁТЧЫК НАД ВАЛЕНСІЯЙ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя ўрада), 25 красавіка. (БЕЛТА). Учора днём над Валенсіяй з'явіўся фашысцкі самалёт. Ён зрабіў некалькі кругоў над горадам. Рэспубліканская зенітная артылерыя прымусіла яго ўдаліцца. Самалёт скінуў некалькі бомб у раёне валенсійскага пляжа. Ёсць адзін ранены. Рэспубліканскія аніцчальнікі праследвалі фашысцкага налётчыка.

АНГЛІЙСКАЯ НОТА АБ АТРУТНЫХ МАТЭРЫЯХ

ЛОНДАН (сталіца Англіі). 23 красавіка. (БЕЛТА). Згодна вестак агенцтва Рэйтэр пакуль няма доказаў, якія-б сведчылі аб тым, што той або іншы бок Іспаніі мае намер прымяніць атрутныя матэрыі. Паводле слоў агенцтва, днямі англійскі ўрад палічыў мэтазгодным звярнуцца з перасцярогаю да абодвух бакоў у Іспаніі, указваючы, што прымяненне атрутных матэрый зрабіла-б адмоўнае ўражанне на сусветную грамадскую думку. З Валенсіі (ад рэспубліканскага ўрада) адказ атрыман, а ад генерала Франко адказу няма.

Газеты «Дэйлі Геральд» і «Ньюс Кронікл» звяртаюць увагу на тое, што Франко не адказаў на англійскую перасцярогу. Орган профсаюзаў «Дэйлі Геральд» пытаецца, як доўга міністр замежных спраў Ідэн мае намер праляўжаць гэты фарс, пасылаючы ноты генералу Франко, які проста кідае іх у карзіну. Гэта прыніжае дастоінства Англіі,—заяўляе газета.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 24 красавіка. (БЕЛТА). Іспанскі ўрад паслаў адказ на ноту Англіі ад 10 красавіка, у якой англійскі ўрад перасцерагаў супроць прымянення атрутных матэрый. Іспанскі ўрад указвае, што ён не дае абавязацельства не прымяняць атрутных матэрый, калі будзе вымушан гэта зрабіць. У ноце гаворыцца, што, па-першае, мяцежнікі, і асабліва італьянцы, могуць успомніць аб паспяховых рэзультатах прымянення атрутных матэрый у Абісініі і паступіць такім-жа чынам у Іспаніі. Па-другое, звярствы, якія ўчыняюцца мяцежнікамі, не даюць падставу верыць якому-б там ні было іх абавязацельству. Па-трэцяе, англійская нота няправільная, бо ставіць на адну дошку законны іспанскі ўрад і кучку здраднікаў. Па-чацвертае, мяцежнікі могуць прымяняць атрутныя матэрыі ў якасці апошняга сродку: падзеі на ўсіх франтах паказваюць узрастаючую перавагу рэспубліканцаў, і мяцежнікі, бачачы сваё паражэнне могуць пайсці на прымяненне атрутных матэрый.

ВЫКРЫТА БАЙКА АБ БЛАКАДЗЕ БІЛЬБАО

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Учора ў баскскія парты Більбао і Сантандэр прыбылі чатыры англійскія параходы. Параходы «Бэрстон» і «Стэсо» прыбылі ў Більбао з Ля-Паліс (Францыя), ня сустрэўшы ніякіх суднаў іспанскіх мяцежнікаў. Параходы «Джэні» і «Ок Гров» прыбылі ў Сантандэр.

Крайсер мяцежнікаў «Эспанья» імкнуўся затрымаць параход «Ок Гров», але атрымаў папярэжанне ад англійскага эсміца і быў вымушан пакінуць параход у спакоі.

Учора, пасля агляду прадстаўнікамі міжнароднага кантролю, з Дувра (Англія) выйшаў у Іспанію англійскі параход «Бакуорс» з грузам харчавання.

ПАЎСТАННЕ СУПРОЦЬ МЯЦЕЖНІКАЎ У ГРЭНАДЗЕ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка, (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе аб успыхнуўшым у Грэнадзе (горад на поўдні Іспаніі), паўстанні супроць мяцежнікаў. У сувязі з гэтым самалёты мяцежнікаў бамбардыравалі Грэнаду.

Згодна паведамлення карэспандэнта ліберальнай газеты «Ньюс кронікл», які прабыў на захваченай генералам Франко тэрыторыі некалькі месяцаў і толькі што вярнуўся адтуль, тэрор па-ранейшаму лютуе ў мясцовасцях, дзе пануюць іспанскія мяцежнікі. Мяцежнікі расстрэльваюць не толькі тых, хто выступае супроць іх, але ўсякага, хто ім не спачувае.

На франтах у Іспаніі

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

У паведамленні штаба рэспубліканскай арміі цэнтральнага фронта, апублікаваным сёння ў поўдзень, гаворыцца: «У раёне ракі Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) мяцежнікі прадпрынялі атаку, якая была энергічна адбіта рэспубліканскімі войскамі.

У раёне, размешчаным на поўдзень ад ракі Тахо, рэспубліканская артылерыя бамбардыравала пазіцыі мяцежнікаў у Толедо, у прыватнасці, епіскапскі палац і будынак пошты.

АРАГОНСКІ ФРОНТ

Згодна афіцыяльнай зводкі, апублікаванай учора ў Валенсіі, на ўсіх участках арагонскага фронта адбывалася значная артылерыйская перастрэлка. Самалёты мяцежнікаў бамбардыравалі дарогу на поўнач ад Уэскі. Рэспубліканцы абстрэльвалі пазіцыі непрыяцеля ў горадзе Уэска.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Як паведамляе спецкор ТАСС з Більбао, на біскайскім фронце ўчора на працягу ўсяго дня мяцежнікі пры актыўным падтрыманні авіяцыі інтэрвентаў і артылерыі прадаўжалі весці атакі на рэспубліканскія пазіцыі ў раёнах Эйбар, Эльгета і Элорыа (на паўднёвы ўсход ад Дуранго). Урадавыя войскі, скарыстоўваючы перасечаную мясцовасць і свае ўмацаванні, аказваюць упартае супраціўленне праціўніку і прычыняюць яму вялікія страты.

Прабыванне Бека ў Бухарэсце

БУХАРЭСТ (сталіца Румыніі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Румынскае агенцтва паведамляе, што польскі міністр замежных спраў Бек выехаў учора з Бухарэста ў Варшаву.

У сувязі з візітам міністра замежных спраў Польшчы Бека ў Бухарэст апублікавана паведамленне, у якім гаворыцца, што ў часе свайго візіта ў Бухарэст Бек меў з міністрам замежных спраў Румыніі Антанеску рад гутарак, датычных розных пытанняў сучаснага міжнароднага становішча, узаемадносін Польшчы і Румыніі з іншымі краінамі, а таксама пытанняў, якія спецыяльна цікавяць абедзве дзяржавы.

ЗАМЕЖНЫЯ РАБОЧЫЯ ДЭЛЕГАЦЫІ—НА ПЕРШАМАЙСКІЯ УРАЧЫСТАСЦІ У МАСКВЕ

МАСКВА, 26 красавіка. (БЕЛТА). З Францыі, Англіі, рэспубліканскай Іспаніі і ряду іншых краін на першамайскія ўрачыстасці ў Маскву прыязджаюць замежныя дэлегацыі рабочых і прафсаюзных арганізацый.

Найбольш шматлікая група гасцей прыедзе з Францыі. Сярод 30 дэлегатаў — прадстаўнікі асобных федэрацый, прафсаюзаў, вялікая колькасць жанчын.

З Англіі ўжо выехала 11 чалавек. Сярод іх афіцыяльная дэлегацыя саюза чыгуначных машыністаў і качагараў на чале з генеральным сакратаром гэтага саюза Скрэнсонам, а таксама прадстаўнікі гарнякоў Паўднёвага Уэльса.

Дэлегацыя рэспубліканскай Іспаніі налічвае 23 чал. У яе складзе прадстаўнікі розных нацыянальных абласцей — рабочыя, сяляне, байцы рэспубліканскай арміі. Прыязджае таксама сын быўшага прэзідэнта рэспублікі Алкала Замора, які змагаецца ў радах рэспубліканцаў.

25 дэлегатаў пасылаюць у Маскву рабочыя розных галін прамысловасці і інтэлігенцыя Чэхаславакіі.

Таварыства прыяцеляў Совецкага Саюза ў Мексіцы паведамляе аб выездзе ў Маскву чатырох мексіканскіх дэлегатаў.

12 чалавек прыедзе з Бельгіі, 5 — з Швейцарыі, 4 — з Нарвегіі. Чакаецца таксама прыезд прадстаўнікоў рабочых і прафсаюзных арганізацый з ЗША, Швецыі, Люксембурга.

Усяго ў першамайскіх урачыстасцях у Маскве прымуць удзел каля 150 іншаземных гасцей. Асноўная маса іх прыязджае ў сталіцу 29 і 30 красавіка.

НА ЗАДВОРКАХ У НАРКОМАСВЕТЫ БССР

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У нашым пісьме гутарка ідзе аб Менскім навукова-даследчым інстытуце школьнай педагогікі. Гэты інстытут, які існуе з 1930 года, арганізаван па пастанове ЦК КП(б)Б у мэтах разгортвання навукова-даследчай работы па педагогіцы. У пастанове ЦК ВКП(б) ад 5 верасня 1931 года «Аб пачатковай і сярэдняй школе» чоткА вызначаны задачы навукова-даследчых педагагічных інстытутаў. У ёй гаворыцца: «Адзначаючы значны адрыў навукова-даследчых устаноў у галіне педагогікі ад практычных задач школы, ЦК ВКП(б) прапануе народным камісарыятам асветы саюзных рэспублік скаяцэнтраваць работу адпаведных даследчых інстытутаў галоўным чынам на вывучэнне і абагульненне вопыту, накопленага практычнымі работнікамі школы».

У адпаведнасці з гэтым рашэннем, ЦК КП(б)Б і СНК БССР не раз указвалі на недавальняючую работу нашага інстытута, асабліва ў справе абагульнення, вывучэння вопыту работы школ і настаўнікаў.

Наркомасветы БССР сістэматычна ігнараваў гэтыя ўказанні. Інстытут быў паза ўвагаю Наркомасветы. Работа без кіраўніцтва, без усякага кантролю ёсць добры доказ таго, што «педагогіка знаходзіцца на задворках у народных камісарыятах асветы».

Так было на працягу ўсіх гадоў існавання інстытута, так астаецца і на сёння. Ніякіх практычных вываадаў у сэнсе ўзмацнення адзінага ў рэспубліцы навукова-даследчага педагагічнага інстытута Народны камісарыят асветы не зрабіў з пастановы ЦК ВКП(б) аб педагагічных скажэннях у сістэме народных камісарыятаў асветы, у якой дана сталінская дырэктыва «адмавіць поўнасцю ў правах педагогіку і педагога».

Адзіны ўчастак работы інстытута, якім цікавіўся Наркомасветы, быў педагагічны сектар, які існаваў да 1934 года. Гэты сектар быў рассаднікам педагагічных скажэнняў, ён выдаваў і распаўсюджваў контрэволюцыйныя тэзісы і анкеты, праводзіў масавыя здзеклівыя абследванні дзяцей, рыхтаваў да друку педагагічныя «працы», у якіх распаўсюджваліся самыя рэакцыйныя, буржуазныя, нацыяналістскія ўстаноўкі накшталт таго, што самыя здольныя дзеці — гэта беларусы, менш здольныя — рускія і зусім нездольныя да навукі — яўрэі. І гэта контрэволюцыйная нечысць Васілеўскага, Гайваронскага і іншых свабодна друкавалася з благаславення Наркомасветы.

Што-ж датычыць педагагічных работ, то за ўвесь час свайго існавання інстытут не выдаў ні адной больш-менш капітальнай работы. У выданых педагагічных работах было шмат ляватства, усякага ляванцкага пражэкцёрства, што нанесла школе нямала шкоды.

Выключна мала зроблена ў сэнсе сапраўднага вывучэння і абагульнення вопыту школ. У гэтым вялікая віна кладзецца на нас, навуковых работнікаў — педагогаў. Мы былі доўгі час адарваны ад школы, мы не змагаліся з педалогіяй і працягвалі яе ўстаноўку, некрытычна падыходзілі да буржуазнай спадчыны, мы рэнна авалодвалі большэвізмам — тэорыяй Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна. Не была на вышыні ў нас большэвіцкая пільнасць. Усё гэта, зразумела, зніжала якасць нашай работы, прыводзіла да ряду памылак і недахопаў.

Праўда, за апошнія два гады намі тое-сёе зроблена па выпраўленню нашых папярэдніх памылак і набліжэнню нашай тэматыкі да задач школы і выхавання работ, карысных для школы, а таксама па абагульненню вопыту работы лепшых настаўнікаў і школ.

Падрыхтаваны да друку навуковыя работы — «Аб арганізацыі і правядзенні ўрока», «Аб метадах паўтарэння вучэбнага матэрыялу на ўроку», «Аб метадах доўгага ўсвядамлення вучнямі гістарычнага матэрыялу», «Аб класным кіраўніку», «Аб мерах педагагічнага ўздзеяння», «Аб выхаванні свядомай дысцыпліны ў піонерскай арганізацыі», работа па гісторыі школы БССР, «Аб крытэрыях ацэнкі паспяховасці школьніка», «Вопыт работы лепшай настаўніцы БССР тав. Прушінкавай», «Аб метадах і ролі практыкавання ў педагагічным працэсе» і цэлы рад іншых.

Падрыхтаван, па заданню Наркомасветы, рад метадычных пісьмаў, у якіх абагульняюцца даныя аб усваенні вучнямі вучэбнага матэрыялу па гісторыі, геаграфіі, рускай і яўрэйскай мовах, па рускай і беларускай літаратуры. Падрыхтавана каля дзесятка лекцый для бацькоў па пытаннях педагагічнай прапаганды.

Такім, за два апошнія гады падрыхтавана да друку каля 60 работ. З іх выдана за два гады толькі адно метадычнае пісьмо — «Аб рабоце класнага кіраўніка». Астатнія-ж работы марынуюцца ў архівах інстытута і Наркомасветы, не гледзячы на тое, што асноўныя работы атрымалі добрыя водзывы маскоўскіх спецыялістаў і практыкаў-настаўнікаў.

Устаў пытанне: куды пашлі 550 тысяч рублёў, што выдаткаваў наш інстытут за гэтыя два гады? Якая карысць ад таго, што ў спісах устаноў Наркомасветы лічыцца наш інстытут? Што атрымлівае настаўнік і школа ад нашага інстытута? Трэба прама сказаць — нічога. Наркомасветы нас называе «бяззэйнікамі». І гэта правільна, калі мы атрымлівае дзяржаўныя грошы і нічога не даем школе і настаўніку. Такую «сістэму работы» — свядомае марнаванне падрыхтаваных да друку работ на працягу двух гадоў — нельга інакш кваліфікаваць, як злачынны сабатаж і шкодніцтва з боку былых дырэктароў Грыневіча і Турчанка.

Гэта шкодніцтва ідзе па трох лініях: сарваць усякую метадычную дапамогу настаўніку і школе, паказаць, што ніякай навуковай работы па педагогіцы ў БССР няма і не можа быць, сарваць усе мерапрыемствы па выхаванню маладых кадраў.

Інстытут за ўвесь час існавання вылучыў двух кандыдатаў навук. Былы дырэктар Грыневіч і яго намеснік Турчанка разагналі педагагічную аспірантуру. З 24 чалавек у 1935 г. зараз асталося толькі 4, якімі ніхто не займаецца, ніхто не кіруе. Па гісторыі педагогікі няма ні аднаго аспіранта, а між тым, большасць педагагічных вышэйшых навучальных устаноў БССР не мае кваліфікаваных работнікаў па гэтаму прадмету. Яшчэ горш абстаіць справа з прыкладнымі методыкамі па беларускай, яўрэйскай, польскай і рускай мовах, гісторыі і літаратуры. Прыём аспірантаў на 1937 год зусім сарван.

Грыневіч і Турчанка зрабілі ўсё для таго, каб пазбавіць інстытут кваліфікаваных кадраў. З інстытута ў 1936 годзе «выйшлі» праф. Рывес, праф. Дардак, старшы навуковы работнік Бязносік, праф. Тэпін і інш. Былі выжыты з інстытута комсамолец Раскін (рэдактар насценнай газеты), які не мірыўся з іх кіраўніцтвам, комсамольцы-аспіранты Смолкін і Балатоўская. У выніку — комсамольская арганізацыя ў інстытуце была ліквідавана.

1937 год інстытут сустрэў без тэматычнага плана. Чатыры месяцы, як работнікі інстытута займаюцца, хто чым хоча. Няма яшчэ зацверджанага плана работы на сёння. У інстытуце ёсць добра абсталяваны фізічны кабінет, коштам прыкладна ў 100 тысяч рублёў, які мог-бы аказаць настаўнікам фізікі вялікую металічную дапамогу, але ён ператворан у кладовую, і частка каштоўных інструментаў і апаратуры папсавана.

Сабатаж і шкодніцтва Грыневіча і Турчанкі стварылі зусім непрыгожае становішча ў інстытуце. Мы не раз узнімалі гэта пытанне перад Наркомасветы, пісалі ў газэты «За коммунистическое просвещение», «Рабочий». Ніхто на гэтыя факты не рэагаваў.

Бесклапотнасць і благадушнасць Наркомасветы (тав. Дзякава) пераходзіць усе межы.

Мы патрабуем рашуча аздаравіць кіраўніцтва інстытута, пакласці канец гэтаму злачынному становішчу, прыцягнуць да адказнасці людзей, якія прывялі да развалу інстытут школьнай педагогікі.

Патрэбна самым уважлівым чынам вывучыць падрыхтаваную да друку прадукцыю інстытута. Усё лепшае, што можа быць скарыстана для палепшання работы настаўніка і школы, трэба надрукаваць. Мы патрабуем умацаваць інстытут кваліфікаванымі работнікамі і стварэння ўмоў, якія-б забяспечвалі арганічную сувязь са школай і настаўнікам.

Прапануем сканцэнтраваць зараз увагу інстытута на манаграфічным вывучэнні вопыту лепшых настаўнікаў-практыкаў, каб да 20-годдзя Кастрычніка даць не менш 10 манаграфій аб лепшых настаўніках і школах, якія вырасці за гады пролетарскай рэволюцыі, каб вопыт іх стаў здабыткам усёй масы настаўніцтва.

Лічым неабходным самым уважлівым чынам вывучыць практыку работы школ гэтага года з пункту гледжання рашучага выкарчоўвання рэшткаў педалагізма, якія яшчэ не знішчаны да канца.

Цэнтральнымі пытаннямі плана навукова-даследчай работы на 1937 год лічым патрэбным паставіць барацьбу з другаголіцтвам, за высокую пісьменнасць па мовах, за ўзнядце ідэйнасці і эфектыўнасці выхаваўчай работы ў школах.

Пара нарэшце ўзяцца за аднаўленне ў поўных правах педагогікі, як гэтага патрабуе ЦК нашай партыі.

Інстытут школьнай педагогікі можа і павінен стаць адным з перадавых інстытутаў орлёнаносных БССР.

Навуковыя работнікі НДІ школьнай педагогікі: А. ЯВОРСКІ, І. ФРЭЙДМАН, С. РАДЗІН, Х. МАТЛІК, М. ЛЯВІЦКІ, Ф. МІТЛІНА, В. ПЕТРЫКАЎ, В. ШАЦ, ОРЛОЎ.

БОЛЬШ КІРАЎНІЦТВА І ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ СТАХАНАЎЦАМ НА СЯЎБЕ

У БЯГОМЛЬСКІМ РАЁНЕ ТРЫВОЖНАЕ СТАНОВІШЧА З СЯЎБОЙ

Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі Бягомльскага раёна да гэтага часу не разгарнулі веснавую сяўбу. На 20 красавіка ім сяўбы выканан толькі на 14,8 проц.

Прычынай запаволі сяўбы, а таксама іншых палявых работ, з'яўляецца тое, што раённы камітэт партыі і райвыканком ухіліліся ад кіравання гэтым, перадаўшы справу сяўбы райзямаддзелу і МТС. Справаздачна-выбарчыя сходы ў первічных арганізацыях не былі выкарыстаны для мабілізацыі ўсіх калгаснікаў на лепшую арганізацыю веснавых сельскагаспадарчых работ, на хутчэйшае іх правядзенне.

Прыкладам можа служыць тое, што ў сваім справаздачным дакладзе, які прадаўжаўся ізве гадзіны 40 мінут, на раённым партсходзе сакратар РК КП(б)Б т. Дэйч нават не ўпамянуў аб ходзе веснавых палявых работ. Тав. Дэйч ні адным словам не абмовіўся аб стаханаўскім руху і, у прыватнасці, аб стаханаўцах сельскай гаспадаркі. Не было названа прозвішча ні аднаго калгасніка ці калгасніцы — перадавікоў сельскай гаспадаркі. Нічога дакладчык не сказаў аб лозунгу таварыша Сталіна — за 7—8 мільярдаў пудоў хлеба і аб разгортванні вакол гэтай справы адпаведнай работы. Таксама не было сказана аб перабудове партыйнай работы ў сувязі з рашэннямі апошняга Пленума ЦК ВКП(б) і даклада таварыша Сталіна.

Прыклад з сакратара ўзялі і выступаючыя ў спрэчках комуністы, якія таксама амаль нічога не гаварылі аб ходзе палявых работ. Нават і выступаўшая ў спрэчках памочнік па політчасці дырэктара Бягомльскай МТС тав. Рудніцкая ўхітрылася абыйсці моўчкі гэта пытанне. На заўвагу сакратару РК КП(б)Б тав. Дэйчу аб тым, што ён у дакладзе нічога не сказаў аб сяўбе, апошні адказаў, што ў яго «непасэўны настрой». Выступаючаму ў спрэчках старшыні райвыканкома т. Шэмпель павялічылі час да 30 мінут з тым, каб ён сігнальна спыніўся на веснавой сяўбе. Аднак, тав. Шэмпель, прагаварыўшы 40 мінут, таксама ўмудрыўся нічога не сказаць аб гэтым.

Абход маўчаннем веснавой сяўбы тлумачыцца толькі тым, што раённыя арганізацыі не ведаюць, што робіцца ў калгасах і як ідуць палявыя работы, бо ніхто з кіруючых работнікаў раёна, і нават МТС, у калгасы не выязджалі, а «кіруюць» сяўбой з кабінетаў. А між тым, становішча з сяўбой у калгасах вельмі небяспечнае як па колькасці выкананых работ, так і па іх якасці.

У калгасе «Памяць Ільіча», Вітуніцкага сельсовета, пад выглядам буксоўкі трактараў ворыва праводзяць глыбінёй на 8—10 сантыметраў і з вялікай колькасцю агрэхаў. Яшчэ горш праведзена ворыва на плошчы каля 10 гектараў у калгасе «Пролетарый», Беразкоўскага сельсовета, у выніку няспраўнасці плугоў. Аднак, старшыні гэтых калгасаў не патрабавалі паляпшэння работы трактараў, а абмяналі гэта. У калгасе «Памяць Ільіча» стаіць трактарная радковая сеялка, працуюць у гэтым калгасе два трактары, аднак, насеў пшаніцы праводзілі ўручную. Наогул, радковая сяўба ў раёне ігнаруецца, і з 11 трактарных сеялак Бягомльскай МТС да 18 красавіка ні адна не працавала, не гаворачы ўжо пра тое, што ізве сеялкі знаходзяцца яшчэ на сядзібе МТС.

Не лепш справа і з работай на конскай цягавай сіле. У калгасе «Пролетарый» да 19 красавіка на конях да палявых работ зусім не прыступалі; у калгасе «Памяць Ільіча з 34 рабочых коней і 2 валоў працавалі толькі пяць пар коней, а ў калгасе імя Варашылава з 40 рабочых коней 19 красавіка ніхто на полі не працаваў.

Пытаннем арганізацыі працы ў калгасах ніхто не займаецца, людзі за брыгадамі не замацаваны, звенні не арганізаваны, улік выпрацоўкі і налічэння працадзён сістаматычна на праводзіцца і ў кніжкі калгаснікам не запісваецца. Налічваюць і запісваюць у кніжкі адзін раз у тыдзень і радзей. Так, у калгасе «Памяць Ільіча» за красавік налічэнне працадзён і запіс у кніжкі не былі зроблены да 19 красавіка.

Аб аднаасобніку. У раёне і сельсоветах лічаць, што зямля аднаасобнікам адведзена, аднак, на справе гэта далёка не так. У Вітуніцкім сельсавеце з 63 аднаасобных гаспадарак план сяўбы прынялі пакуль толькі 18 гаспадарак, а астатнія ў большасці сваёй або адмаўляюцца ад плана, або ім не зроблен адвод участкаў у натуры. Сельсоветы і райвыканком лічаць, што іх абавязак толькі ўказаць участак, а размеркаванне па асобных гаспадарках — гэта ўжо не іх справа.

Апрача таго ў Бягомльскім раёне парушаецца закон аб землекарыстанні калгасаў; аднаасобнікам адводзяць зямлю за кошт калгасных земель. Так, у вёсцы Небышыно, Вітуніцкага сельсовета, аднаасобнікам за кошт калгаса адведзена 5 гектараў зямлі. Поўнасцю за кошт калгаса адведзена зямлі аднаасобнікам і ў вёсцы Забор'е, гэтага-ж сельсовета. Такія-ж сігналы ёсць і з іншых сельсоветаў.

Усе гэтыя даныя з усёй відавочнасцю гавораць аб дрэнным становішчы з сяўбой у калгасах і аднаасобных гаспадарках Бягомльскага раёна.

МАЛОЧКА.

30 жанчын-трактарыстак працуюць на калгасных палях Клічаўскага раёна. НА ЗДЫМКУ: трактарыстка А. А. Белазор, забаранаваўшы за дзень 40 гектараў, зварочваецца з работы.

Фото Я. Салавейчыка.

ЗАБЫЛІСЯ НА ТРАКТАРЫСТАЎ

Першая трактарная брыгада Бярэзінскай МТС абавязалася ў перыяд веснавых работ дзень на кожны трактар не менш 300 гектараў. У брыгадзе тры «ХТЗ», адзін «ЧТЗ» і адзін «Універсал». Да 20 красавіка трактары выканалі работу на плошчы 195,9 гектара.

Лепшыя трактарысты Ярмаловіч і Шчыпіла Тонг ўвесь час перавыконваюць норму. Яны ўзорваюць у сваю змену на 5 і больш гектараў, пры норме 3,8 гектара. Але гэта іх не задавальніце, бо могуць зрабіць куды больш. Брыгадзір Маркоўскі Майсей скардзіцца, што для работы трактарыстаў не створаны патрэбныя ўмовы. Ніхто не дапамагае ў работе брыгады, каб разгарнуць стаханаўскі рух. Дагавор па социялістычнаму спаборніцтву астаўся ляжаць пад сукном у дырэкцыі МТС. На поле, дзе працуюць трактарысты, ніколі не прыязджае намеснік дырэктара па політчасці Шырокі і старшыня рабкома Камлюк. Газеты не выпісаны, гутаркі і выворчыя нарады не праводзяцца.

Дырэкцыя МТС не клапоціцца аб рабоце трактарыстаў. Дырэктар тав. Краўчанка і яго намеснік тав. Шырокі не толькі не стварылі ўмоў для работы, а наадварот, зрываюць выкананне іх абавязацельстваў. Большасць брыгад не выконваюць норм выпрацовак толькі таму, што МТС не забяспечыла трактары гаручым. У сёмай брыгадзе трактары больш часу прастойваюць толькі таму, што ёсць перабой з падвозам газы. Гэта брыгада мае толькі адну бочку. Трактары не забяспечаны дробнымі запаснымі часткамі і інструментам. Працуюць толькі ў дзве змены, бо для начной работы няма лямпак.

Нічым не лепшае становішча ў астатніх трактарных брыгадах. Дырэкцыя МТС нічога не зрабіла для таго, каб забяспечыць бесперабойную работу трактарнага парка, каб трактарысты перавыконвалі нормы. Аб кадрах у МТС не клапоцяцца. Людзей выправілі ў поле і аб іх забыліся.

А. ЛОСЬ.

ПОЎНАСЦЮ ЗАХОЎВАЦЬ АГРАТЭХНІКУ

Праведзенай у радзе раёнаў праверкай якасці сяўбы ўстаноўлена, што некаторыя старшыні райвыканкомаў і асабліва загадчыкі райзямаддзелаў і дырэктары МТС не арганізавалі барацьбу за выкананне агратэхнічных мерапрыемстваў пры правядзенні веснавых работ.

Група раёнаў нецярпіма адстае па радковай сяўбе. Адносіцца гэта ў першую чаргу да Кіраўскага, Талочынскага, Слуцкага, Круглянскага, Клічаўскага, Смалявіцкага, Менскага, Любаньскага, Бярэзінскага, Чэрвеньскага, Лагойскага і Барысаўскага раёнаў. План радковай сяўбы ў гэтых раёнах выканан толькі ад 1 да 16 процантаў. Названыя і рад іншых раёнаў зусім дрэнна вядуць падсеў канюшыны і выцяжленне насенных участкаў, слаба праводзіцца сяўба гатунковым насеннем.

Грубейшыя парушэнні агратэхнікі выяўлены ў Чэрвеньскім, Ушацкім, Смілавіцкім, Лёзнянскім, Гроскім і інш. раёнах. Сяўба праводзіцца неачышчаным і непратручаным насеннем, дапускаецца мелкае ворыва, агрэхі, сяўба ўаднавор, дрэнная заделка насення і т. д.

У сувязі з гэтым Саўнарком БССР выдаў распараджэнне, якім абавязаў старшынь акрвыканкомаў і райвыканкомаў, загадчыкаў райзя і дырэктароў МТС і саўгасаў прыняць усе захады да выпраўлення дапушчаных памылак і забяспечыць сапраўднае разгортванне социялістычнага спаборніцтва ва ўсіх калгасах і саўгасах на барацьбу за высокую якасць палявых работ, на безумоўнае выкананне ўсіх устаноўленых урадам агратэхнічных мерапрыемстваў па апрацоўцы глебы і сяўбе.

СНК БССР указаў старшыням РВК, загадчыкам райзя і дырэктарам МТС паўночных і цэнтральных раёнаў (Мехаўскага, Лагойскага, Багушэўскага, Барысаўскага, Крупскага, Полацкага, Лёзнянскага, Асвейскага, Суражскага, Гарадоцкага, Дзержынскага і інш.) на недапушчальнае адставанне гэтых раёнаў па тэмпах і якасці сяўбы і патрабуе выпраўлення дапушчаных памылак.

РАЗБАЗАРВАННЕ КАЛГАСНАЙ ЗЯМЛІ

Праўленне калгаса «За ўраджай», Рымавецкага сельсовета, Бабруйскага раёна сістаматычна займаецца продажам і здачай у аренду калгасных земель. У мінулым годзе, такім чынам, было разбазарана асабіста старшынёй праўлення калгаса Спепановічам 3 гектары, ў а гэтым годзе плошча здадзенай у аренду зямлі павялічылася ў некалькі разоў.

Спепановіч ні перад чым не спыніўся, разбазарваў і разбазарвае калгасную зямлю направа і налева, афарміляючы ўсё гэта нават пратаколам. Так у пратаколе пасяжэння праўлення ад 4 сакавіка запісана: «Вызначыць ва ўрочышчы «Дзяўчын» кавалак зямлі рабочым цыклозавода «Коминтерн» для пасеву бульбы».

Адзін перад другім рабочыя цыклозавода бралі, размяралі і дзялілі паміж сабой участкі калгаснай зямлі. Кожны імкнуўся захапіць як мага больш. Такім чынам, толькі ва ўрочышчы «Дзяўчын» раздана калгасам у аренду 12 гектараў. Ва ўрочышчы «Барсукі» дырэктар былога саўгаса цыклозавода «Коминтерн» Гаршарук заняў 0,70 гектара, былы агарэпцік саўгаса Давыдоўскі заняў невядома на якіх умовах 0,40 гектара. Такім чынам, па калгасу «За ўраджай» здадзена ў аренду зямлі з калгаснага масіва каля 15 гектараў.

Нядаўна аб гэтай махінацыі даведаліся загадчык бабруйскага райзя т. Аўсяніка і намеснік старшыні райвыканкома тав. Волкаў. Даведаліся, але нічога не прадпрынялі, каб адмяніць шкоднае рашэнне праўлення калгаса. Па-таварыску сказалі старшыні праўлення калгаса Спепановічу, што так рабіць нельга, аднак, Спепановіч прытрымлівацца свайго. Цяпер арандатары беспарашкодна вывозяць гной на калгасную зямлю (ужо вывезена каля 200 вазоў гною), збіраюцца сеяць бульбу.

Ніхто з раённых арганізацый не растлумачыў кіраўнікам калгаса «За ўраджай», што зямля з'яўляецца дзяржаўнай уласнасцю і не падлягае ні куплі ні продажы, ні здачы ў аренду.

Практыка здачы калгаснай зямлі ў аренду распаўсюджваецца па многіх калгасах Рымавецкага сельсовета. У калгасе «Чырвоны агарод» (старшыня Сінкевіч) такімжа парадкам раздана розным асобам каля шасці гектараў. У калгасе імя Леніна вызначылі з калгаснага масіва ўчастак для пасеву бульбы сельскаму ўрачу Адамовічу.

Старшыня Рымавецкага сельсовета Трухановіч, ведаючы аб усіх гэтых антыдзяржаўных здзеяннях праўлення калгаса, ніякіх мер не прыняў да таго, каб спыніць разбазарванне калгаснай зямлі.

П. ПАТАПЕЙКА.

ЯК ВІЦЕБСКІ ГОРСОВЕТ ЗАБЫЎ ТРЭЦЬ ВЫБАРШЧЫКАЎ

На невялікай плошчы, што перасякае Шасейную вуліцу, каля трансфармарнай будкі сядзіць група дравасекаў і пільшчыкаў. Тут-жа ляжаць іх прылады вытворчасці — тапары, пілы. У чаканні з'яўлення заказчыка яны аб чымсьці гутараць.

Наша ўтаржэнне ў іх гутарку некалькі ўспалохала гэтых шырокаплечых, здаровых людзей. Даведаўшыся, што мы не прышлі наймаць іх на работу, яны недаверліва паглядзелі на нас, адзіўленымі вачыма пераглянуліся паміж сабой. Не прывыклі яны, каб з імі гутарылі па пытаннях, якія не маюць ніякіх адносін непасрэдна да іх работы. Мы-ж завялі гутарку аб новай Канстытуцыі, прадстаўчых выбарах дэпутатаў у Саветы працоўных, аб рабоце горсовета і т. д.

Спачатку яны неахвотна адказвалі на нашы пытанні, усё яшчэ недаверліва аглядалі нас, але мала-па-малу гутарка ажыўлялася. Закранутае намі зацікавіла іх. Пытанні пачалі следаваць адно за другім: хто будзе карыстацца выбарчымі правамі, якая будзе тэхніка выбараў, што азначаюць роўныя, прамыя выбары і т. д.

З гутаркі з дравасекамі і пільшчыкамі мы даведваемся аб адным непрыемным для віцебскага горсовета факце. Аказваецца, што гэтыя людзі забыты горсоветам, яны не ведаюць сваіх дэпутатаў, яны не ўдзельнічалі ў мінулых выбарах, ні разу іх не выклікалі на сход.

—З намі яшчэ ніхто аб новай Канстытуцыі не гаварыў, — заўляе з крыўдай пільшчык, які назваў сябе Базюліным. На мінулых выбарах мы дэпутатаў не выбіралі. Аб рабоце горсовета мы нічога не ведаем.

— Што праўда то праўда, — перабівае яго дравасек Арэшкін, — нашага брата горсовет проста скінуў з рахунку.

Ці абыйдзены адны толькі пільшчыкі і дравасекі? Не. У такім-жа становішчы знаходзяцца цялежачнікі, ламавыя і легкавыя ізвозчыкі, саматужнікі-адзіночкі. Аб існаванні гэтай катэгорыі людзей горсовет зусім забыў. У гэтым мы пераканаліся з нашых разгавораў з рознымі групамі так званага неарганізаванага насельніцтва. Нам. заг. оргмасавым аддзелам горсовета т. Крымцевіч пачаў даказваць нам, што аб гэтай групе насельніцтва наўрад ці варта наогул гаварыць, сярод выбаршчыкаў яны, маў, па колькасці складаюць нязначную велічыню.

— Гэта ўсяго якіх-небудзь 100—150 саматужнікаў-адзіночак, — закончыў ён і, самадавольна ўсміхнуўшыся, махнуў рукой.

Нікудышняя, шкодная матэматыка. На самай справе гэта «нікчэмная велічыня» складае вялікую праслойку насельніцтва. Саматужнікі-адзіночкі, шаўцы, краўцы, гадзіннікавыя майстры, кавалі, пільшчыкі дроў, ізвозчыкі і грузчыкі, інваліды працы і вайны, хатнія гаспадыні і іншыя дарослыя ўтрымацы — усе яны разам па самых скромных падліках складаюць больш 30 проц. выбаршчыкаў.

У горсовеце будуць абураны такім падлікам. Тут, напрыклад, лічаць, што хатнія гаспадыні, інваліды працы і вайны — гэта арганізаваныя выбаршчыкі, сярод якіх дэпутацкія групы прадпрыемстваў праводзяць сістаматычную масава-палітычную работу.

Зноў-такі шкоднае самашуканства, нічога агульнага з сапраўднасцю не маючае. Старшыня дэпутацкай групы завода імя Кірава т. Сандлер сам не адмаўляе таго, што сярод жонак рабочых — хатніх гаспадынь, бацькоў — старых масава-палітычная работа праводзіцца вельмі слаба. За 1936 год дэпутацкая група толькі адзін раз сабрала жонак рабочых для азнаямлення іх з новай Канстытуцыяй і нават у гэты адзіны раз сход быў малалікі. Яшчэ горшае становішча на фабрыцы імя Клары Цэткін. Тут з дарослымі ўтрымацамі рабочых ніякай работы не праводзяць. Мы гутарылі з дзесяткамі хатніх гаспадынь, са старымі, інвалідамі вайны і працы — усе яны, за рэдкім выключэннем, не памятаюць выпадку, каб іх калі-небудзь сабралі для вывучэння Сталінскай Канстытуцыі, для абмеркавання важнейшых рашэнняў партыі і ўрада. Вельмі мала хто з іх ведае свайго дэпутата ў горсовеце. І гэта зразумела. Дэпутаты, выбраныя ад неарганізаванага насельніцтва, не звязаны са сваімі выбаршчыкамі, не лічаць сваім доўгам сістаматычна інфармаваць іх аб ходзе выканання наказаў і аб мерапрыемствах, праводзімых горсоветам.

Характэрны прыклад. Дэпутат горсовета т. Журавіна выбрана ад утрымацаў групкома будаўнікоў. Яна прымае актыўны ўдзел у рабоце гандлёвай секцыі. Журавіна расказала нам аб выкананых ёю дзесятках даручэнняў горсовета. За апошні час, напрыклад, яна правярала вагавую гаспадарку ў магазінах горада, правіянасць водпуску прадуктаў і т. д. Але, на жаль, Журавіна не магла ўспомніць хоць-бы адзін пункт з наказа горсовета, данага ёй выбаршчыкамі. У горсовеце, відавочна, не лічаць патрэбным азнаёміць яе з наказам і дапамагчы практычна яго выконваць. Вось чаму, калі ёй у мінулым годзе прышлося адчытваць перад выбаршчыкамі, яна гаварыла толькі аб рабоце секцыі і нічога не магла сказаць аб выкананні наказа.

Калі віцебскі горсовет не можа пахваліцца добрай работай з дэпутатамі, выбранымі на фабрыках і заводах, то можна сабе ўявіць, якая работа з дэпутатамі, выбранымі ад неарганізаванага насельніцтва. Прэзідыум горсовета, напрыклад, не знайшоў часу для таго, каб хоць раз абмеркаваць сур'ёзна пытанне аб правядзенні масава-палітычнай работы сярод неарганізаванага насельніцтва.

Е. СТОЛІН,
А ЗАРУБЕЖНЫ

ЗА ШЫРМАЮ ЗВОДАК

МАГІЛЁЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Згодна афіцыяльнай зводкі, аўтарэмзавод імя Кірава ў першым квартале бягучага года выканаў план па рамонту машын у студзені на 102,3 проц., у лютым на 100 проц., у сакавіку на 98,8 проц. У сярэднім за 3 месяцы — на 100,3 проц. Кіраўнікі завода, аперуючы гэтымі данымі, крычаць усюды, дзе толькі можна, што завод пачаў прапаваць лепш, што з кожным днём растуць тэмпы і павышаецца якасць прадукцыі. Магілёўскі гарком партыі і горсовет, паверыўшы прадстаўленым лічбам, паспяшылі перадаць аўтарэмзаводу свой пераходны сцяг, «як лепшаму прадпрыемству».

Між тым, сапраўднае становішча рэчаў далёка не адпавядае даным зводкі. Апошняя складалася на аснове самага бессаромнага вочкаўпірацельства і ашуканства. Каб «выканаць план», здаваліся на склад і ўключаліся ў зводку як гатовая прадукцыя машыны, рамонт якіх яшчэ не быў закончан і якія ўжо праз некалькі дзён ішлі назад у цэх. Так, 28 лютага на склад паступіла 25 машын з шматлікімі дэфектамі, прычым частка гэтых машын аказалася не ўкамплектаванай рознымі дэталямі. Не гледзячы на гэта, іх уключылі ў зводку, бо кіраўнікам завода патрэбна была толькі відзімасць «выканання месячнага плана».

Яшчэ больш абураючымі сродкамі была сфабрыкавана зводка ў сакавіку. 31 сакавіка памочнік нач. аддзела збыта т. Кільчыцкаму і загадчыку складам Блешанкіну прынеслі з кузаўнага цэха 23 пашпарты машын і перадалі вусная распараджэнне дырэкцыі завода ўключыць іх у зводку прынятай гатовай прадукцыі. Машыны сталі яшчэ ў цэхах не адрамантаванымі, але для вочкаўпірацеляў гэта нічога не азначала.

Характэрна, што пасля гэтага на працягу некалькіх дзён або зусім не паступалі гатовыя машыны, або паступалі ў мізэрнай колькасці. Так, 1 і 2 красавіка не паступіла ні адна машына, а 3 і 4 паступала толькі па 6 машын. У гэтыя дні завод запаўняў прабелы і заканчваў рамонт машын, «авансам» уключаных у зводку. Тое-ж самае было і ў пачатку сакавіка: 1 і 3 чысла не паступіла на склад ні адна машына, 2-га — 4 машыны, і т. д.

Ці не характарызуюць гэтыя вочкаўпірацельскія камбінацыі кіраўнікоў аўтарэмзавода як работнікаў, «якія падпісваюць, каб прыхарашыць сваё становішча перад вышэйстаячымі органамі, няправільныя рапарты аб скончанні пабудоў і аб выкананні вытворчых планаў раней сапраўднага іх выканання? Для таго, каб хутчэй высунуцца, пакрасавацца хаця-б на момант, іншы раз і нядрэнныя арганізатары-гаспадарнікі ідуць на фальш, на абман дяржавы. А ўжо вакол такіх кіраўнікоў-кар'ерыстаў шукайце кучу падхалімаў і халуёў, за спіну якіх так зручна хавацца ўсялякім шкоднікам-мярзотнікам». (Молатаў).

Да гэтага часу на заводзе шырока практыкуецца «раздзяванне» гатовых машын, знятае з іх розных дэталяў. Амаль кожны дзень пры здачы заказчыкам машын выяўляецца, што ў іх недастае шмат дэталяў. Гэтыя часткі раскрадваюцца беспадарана. Кіраўнікі завода адносяцца да гэтых фактаў са здзіўляючай абыякавасцю, як да чагосьці нешкодлівага. Між тым, варта было-б толькі абгаразіць месца, дзе стаяць адрамантаваныя машыны, і ўзмацніць ахову склада, як гэтыя агідныя спыніліся-б.

Але на складзе стаяць не толькі «раздзетыя» машыны. Многія машыны выходзяць з мантажнага цэха не ўкамплектаванымі ўсімі дэталямі. Вельмі часта ўжо на складзе выясняецца, што машына без сігнала, без сігнальнай кнопкі, без абмежавальнікаў педаляў і інш.

Наогул, якасць рамонту машын абураюча нізкая. Хапя перш чым выйсці з мантажнага і кузаўнага цэхаў машына не раз праходзіць праз аддзелы тэхнічнага кантролю, але гэты «кантроль» да таго павярхоўны, што на склад часта ідзе супальны брак. Кожны раз, калі машына выпрабоўваецца, перад тым як здаць яе заказчыку, склад вымушан складаць доўгія дэфектныя ведамасці і займацца на месцы новым рамонтам. На складзе ўтварылася такім чынам апрача, так-званых, дэфектных брыгад, існуючых пры цэхах, яшчэ і свая дэфектная брыгада. Вось, для прыкладу, дэфектная ведамасць на машыну ГАЗ-1832, адна з шматлікіх ведамасцей, якія складаюцца на складзе: 1) няма гаек да калёс і шпілек; 2) няма багажніка; 3) няспраўныя кручкі кузава; 4) няма тавотніц; 5) пабітае шкло дзверак; 6) трэба пафарбаваць усю машыну; 7) умацаваць фары; 8) падцягнуць галоўку блока; 9) давярнуць свечкі; 10) пафарбаваць матор; 11) змяніць утулку падсоса; 12) падцягнуць картэр матора; 13) з каробкі хутчэйшай цячэ масла.

Часта склад не можа сам выправіць усе нелахопы, і тады машына ідзе ў цэх на паўторны рамонт. У выніку — заказчыкі вымушаны чакаць на заводзе па 3—4 дні, пакуль машына канчаткова будзе адрамантавана.

Як-жа глядзяць на гэта масавае бракаробства кіраўнікі завода? Яны прабуюць узваліць усю віну і адказнасць за сваю дрэнную работу на... заказчыка. Калі ён літаральна праз некалькі дзён вазмае машыну для паўторнага рамонту, з яго патрабуюць за гэта ў другі раз плату, хоць заказчык і не вінен за агіднасці, што творацца на заводзе. Да вашага карэспандэнта прышлі прадстаўнікі калгаса «Коминтерн», Савіцкага сельсовета. Дамаванівіцкага раёна, з скаргай на аўтарэмзавод. Калгас аддаў заводу сваю паўтаратонную грузавую машыну для рамонту і атрымаў замест яе другую машыну, заплаціўшы за гэта 3.500 руб. Але праз 8 дзён выявілася, што атрыманая машына паспраўна: у палец цыліндра, які звязвае поршань з шатуном, не было ўкладзена стопарнае кальцо. У выніку палец выпаў з свайго месца і зрабіў у цыліндры праразі глыбінёю ў 4 міліметры. Калі калгас, склаўшы адпаведны акт, прывёз машыну назад на завод, то галоўны інжынер завода Марозаў заявіў:

— Мы вам машыну адрамантуем, але за ваш рахунак. Гэта будзе каштаваць 800 руб.

Як назваць такія адносіны да заказчыка, як не прамым здзекам?

Усё гэта сведчыць аб тым, што кіраўнікі аўтарэмзавода (дырэктар т. Ніканораў, галоўны інжынер т. Марозаў, сакратар парткома т. Рыўкін, старшыня заўкома т. Соркін) не зрабілі для сябе ніякіх высноў з рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна, не мабілізавалі сябе і ўвесь рабочы калектыў на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, што рабілася на заводзе выкрытымі не так даўно ворагамі народу.

С. ГАЛКІН.

Пісьмы з аршанскага ільнокамбіната

НА БУДАЎНІЧАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

Ворагі народу нямала прыклалі намаганняў, каб сарваць будаўніцтва важнейшага прамысловага гіганта—Аршанскага ільнокамбіната. Тут арудавала выкрытая зараз контрраволюцыйная група шкоднікаў на чале з начальнікам будаўніцтва Козеляевым. Усякімі метадамі гэтыя дыверсанты зацягвалі тэрмін скончання работ. Шкоднікі праекты выклікалі безліч перароблак, удараджалі кошт будаўніцтва.

Ход работ на будаўнічай пляцоўцы сёння не дае права заявіць, што тут пабольшэвіцку ўзяліся за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

У пастанове ЦВК і СНК СССР аб народна-гаспадарчым плане на 1937 год сказана: «Скончыць будаўніцтва і пусціць у дзеянне Аршанскі ільнокамбінат». На кіраўніцтва камбіната (дырэктар Негнявіцкі, начальнік будаўніцтва Авербух, сакратар парткома Баскін) ускладзены адказныя задачы па выкананню важнейшага ўрадавага задання. Прайшоў першы квартал, але няма чым пахваліцца будаўнікам. За тры месяцы план выкананы толькі на 47,1 проц. Праведзена работа на 718 тыс. руб., замест 1.527 тыс. руб., прадугледжаных планам. Калі дадаць да гэтага, што за студзень і люты будаўніцтва мела 369 тыс. руб. страт (замест знікэння себекошту) з-за дрэнных арганізацыі работ, то малюнак бяздзейнасці і бясклопатнасці кіраўнікоў будоўлі стане зусім ясным.

Не лепшая перспектыва і ў другім квартале. На гэты перыяд адпушчана 3,718 тыс. руб. Поўнасцю павінна быць скончана будаўніцтва прамысловых корпусаў і некаторых жыллёвых аб'ектаў, але зараз усё будаўніцтва, па сутнасці, замарожана. Няма матэрыялаў (цемента, труб), нехапае грошай. Кіраўніцтва камбіната па прыкладу свайго глаўка, прытрымліваецца Устаноўкі, што камбінат у гэтым годзе не будзе пушчан, што вызначаны ўрадам тэрмін будзе сарваны.

Будаўніцтва аб'ектаў намнога затрымліваецца з-за сістаматычнай перароблкі праектаў. Інжынер кіраўніцтва Струкаў, які прагледаў праекты, пускаў іх у ход без усялякіх заўваг, хаця для кожнага, хто хоць колькі-небудзь разумее ў гэтай справе, павінна было быць ясна, што будаўніцтва па даных чарцяжах з'яўляецца проста шкодніцтвам і прывядзе да вельмі дрэнных вынікаў. Гэты інжынер і зараз лічыцца тут, як незамянімы спецыяліст.

У ткацкім цэху не на сваім месцы ўстанаўлялі апорныя калоны, што магло прывесці да абвалу столі. Геклінг-машыны расстаўляліся адна каля другой на аддалечы 55 сантыметраў, што затрудняе іх абслугоўванне і вельмі небяспечна ў выпадку пажару. Галоўны механік Каралёў, калі яму на гэта ўказалі мантажнікі, адказаў: «Як спраектавана, так і паставім». У многіх жылых дамах праекты будаўніцтва карпусоў не супадаюць з праектамі сантэхнічных работ. Гэта прыводзіць да няправільнай устаноўкі пячэй паравога апаплення і вентыляцыі.

У пачатку 1936 г. на камбінат прыехаў новы начальнік будаўніцтва — Авербух. Не паспеў ён прабыць некалькі дзён, як сюды пацягнуліся яго «хвасты». Гэты, не такі ўжо вялікі начальнік прывёз з сабою цэлы штат інжынераў, тэхнікаў, планавікоў, снабжэнцаў, дзесятнікаў.

Авербух перадаверыў кіраўніцтва будаўніцтвам «сваім людзям». Уся работа на прамысловай пляцоўцы была даручана інжынеру Івашкіну. Як-жа спраўляецца гэты спецыяліст? Пры заліўцы асфальтам подлогі ў прадзільным і мокра-ватэрным цэхах грунт загадзя не быў утрамбаван, і пры ўстаноўцы варштатаў падлога правальваецца. Зараз прыходзіцца ў другі раз перарабляць 1.200 кв. метраў падлогі. У гэтых-жа цэхах абвальваецца са сцен тынкоўка. Можна прывесці яшчэ рад падобных фактаў — вынік агіднага кіраўніцтва Івашкіна. Гэтыя паломкі і перароблкі каштавалі камбінату больш сотні тысяч рублёў. Між тым, аўтарытэт Івашкіна да гэтага часу непахісны ў начальства.

«Арцельшчык» Авербуха тэхнік Гурэвіч кіраваў будаўніцтвам воданапорнай вежы. Вывеўшы больш 20 метраў, агледзеліся, што вежа нахілена ў бок на 7—8 сантыметраў. Зараз зусім спынілі работу. Гэта таксама тут лічаць «тэхнічнай памылкай».

Начальнікам аддзела снабжэння будаўніцтва з'яўляецца трэці прыяцель Авербуха — Табакоў. Ён пэнэцца кіраўніцтвам як чалавек, які можа ўсё дастаць «па блату» і па знаёмству. Гэта зусім не рэкамендуе ні Табакова, ні яго пакрывальнікаў. На справе-ж зараз будаўніцтва мае вялікую патрэбу ў будматэрыялах. Не хапае цэменту, вапны, жалезнай арматуры, піламатэрыялаў і інш.; між тым, «здольны» снабжэнец Табакоў не змог нават атрымаць 12 вагонаў цэменту, на якія атрыманы ўжо нарады.

Прытуленне пільнасці кіраўнікоў камбіната, сямейственасць і заціск крытыкі і самакрытыкі стварацоць спрыяльную глебу для злачынных дзеянняў ворагаў народу, якія тут да канца яшчэ не выкрыты.

І. ТУРЭЦКІ.
А. ЛІХАДЗІЕЎСКІ.

БЛЫТАНІНА І САМАЦЁК

(Пісьмо з Гомеля)

Калі прыгледзешся да работы Беларускага радыёкамітэта, то адразу можна заўважыць, што нячоткасць, блытаніна, зрывы намечаных ім-жа мерапрыемстваў з'яўляюцца сістэмай.

У сярэдзіне снежня радыёкамітэт папярэдзіў работнікаў радыёвузлоў, што трэба заняцца падрыхтоўкай да калектыўнага слухання пушкінскай перадачы «Барыс Гадуноў», якая будзе трансліравацца па радыё ў спецыяльнай пастаноўцы. Радыёвузлы правялі падрыхтоўчую работу, але перадача так і не адбылася.

Некалькі пазней радыёвузлы атрымалі спешныя пісьмы аб тым, што 7 сакавіка будзе перадавацца опера Моцарта «Свадьба Фигаро». У пісьме прапанавалася прыступіць да правядзення масавай работы—папулярызаваць у мясцовай газеце, у шматтыражках, расклеіць афішы, распаўсюдзіць лібрэто. За дзень да перадачы оперы з'яўляецца тэлеграма: «Опера «Свадьба Фигаро» пераносіцца на сярэдзіну месяца. Аб дні паведамім асобна».

Уся работа з радыёслухачамі праводзілася дарэмна.

14 лютага загалучкі радыёвузлоў атрымалі тэлеграму: «Прапануем вам 10 лютага гэтага года трансліраваць станцыю «Комінтэрн». 12 лютага трансліраваць Менск — пушкінскія вечары. Арганізуйце калектыўнае слуханне, возгукі шліце нам. Старшыня радыёкамітэта пры СНК БССР Горачаў».

Можна было-б падумаць, што наблытаў тэлеграф, але тэлеграф тут непрычым.

Аказваецца тэлеграма была паслана радыёкамітэтам 13 лютага ў 12 гадзін 46 мінут.

Калі-ж намечаныя перадачы праз менскую радыёстанцыю і выконваюцца, то яны амаль ніколі не ўкладваюцца ў вызначаны ў праграме час. Пасля менскай радыёстанцыі нельга пераключыцца на другую станцыю. Або прыходзіцца ўключацца ў сярэдзіну другой перадачы, або рабіць перапынак на 15—20 мінут, што выклікае справядлівае абурэнне радыёслухачоў.

Ды не толькі ў галіне арганізацыі перадач дрэнна працуе Беларускі радыёкамітэт. Возьмем хоць-бы пытанне падрыхтоўкі кадраў. За апошні час радыёкамітэт два разы склікаў аднамесячныя курсы перападрыхтоўкі работнікаў вяшчання. Першыя курсы, скліканыя 1 снежня 1936 года, былі зусім не падрыхтаваны. Прыехаўшыя курсанты павінны былі шукаць сабе памяшканне для начлега. Праграма, курсаў была складзена без усякай мэтаімкнёнасці.

Такім-жа чынам былі праведзены і курсы, скліканыя 20 снежня 1936 года. Быў затрачан час, былі затрачаны сродкі, а карысці курсы не прынеслі.

Ужо на прапягу поўгода радыёкамітэт перабудоўвае сваю работу, але станоўчых вынікаў яшчэ не відаць, наадварот, стала яшчэ больш блытаніны. Калі раней быў пазаны аддзел вяшчання, ад якога радыёвяшчанне на мясцах атрымоўвала ўказанні, то цяпер гэты аддзел ліквідаваўся і арганізавана планавая група. Калі раней радыёвяшчанне ведала аднаго начальніка, то цяпер 5 начальнікаў — і кожны па-свойму патрабуе вестак, шле дырэктывы.

Газорачы аб кіраўніцтве Беларускага радыёкамітэта на месцах, трэба сказаць, што ад яго амаль из паступае ні інструктыўных пісем, ні растлумачэнняў таго або іншага пытання, асабліва па выпусках апошніх паведамленняў. Радыёкамітэт не склікае ўпаўнаважаных па пытаннях аб прадстаўчай рабоце радыёвяшчання — усё ідзе самацёкам.

ГІХ.

ШКОДНАЯ ТРАДЫЦЫЯ КЛІМАВІЦКІХ УРАЧЭЙ

Мой брат Ехіел працаваў у клімавіцкай арцелі «Металіст» у якасці кавала. Ён быў комсамольцам-стаханаўцам. Увесь час перавыконваў нормы.

10 сакавіка гэтага года ў часе работы захварэў. Рабочыя арцелі даставілі яго дамоў. Патрабавалася тэрміновая медыцынская дапамога. Сястра зараз-жа пабегла выклікаць урача. Па дарозе яна сустрэла доктара Фрыдкіна, літаральна некалькі крокаў ад хаты. З плачам яна ўпрашвала яго аказаць дапамогу хвораму брату, але ніякія просьбы не дапамаглі: ён адмовіўся зрабіць гэту ласку.

На дапамогу ў растукванні мельцынскіх работнікаў пашла комсамолка Расіна, якая знайшла двух мельцынскіх сяспёр Айзенберг і Ачкінадзе. Але па прыкладу свайго ўрача Фрыдкіна, яны таксама катэгарычна адмовіліся пайсці да хворага.

І толькі пры ўмяшанні РК КП(б)Б і раённай газеты «Комуна» урач прышоў, але было ўжо позна: брат памёр.

АПАРЦУФ.

АД РЭДАКЦЫІ. Пры праверцы на месцы нашымі супрацоўнікамі факты поўнасцю пацвердзіліся.

У свой час «Правда» (3 ліпеня 1935 года) пісала аб аналогічным факце бяздушных адносін клімавіцкіх урачоў да дзіцяці калгасніка Марозава. Справа гэта тады прагрымела па ўсёй Беларусі, быў паказальны працэс. Аднак, клімавіцкія ўрачы аказаліся ў ролі Іванаў Непамятаючых і паўтараюць тварыць гэтыя-ж справы.

Рэдакцыя спадзяецца, што пракуратура рэспублікі прыцягне да найтяжэйшай адказнасці вінаватых у смерці комсамольца-стаханаўца т. Апарцуфа.

У Маскву з Одэсы прыехаў выдатны совецкі майстар скрыпак Леў Владзіміравіч Дабранскі. Яго скрыпкі «СССР» карыстаюцца вялікай папулярнасцю. НА ЗДЫМКУ: т. Дабранскі ў сваёй майстэрні за вырабам новых скрыпак маркі «СССР».

Фото В. Макарава (СФ).

НАСУСТРАЧ ПЕРШАМУ МАЯ

ВЕСЕЛА СУСТРАКАЮЦЬ СВЯТА

Як паведамляе газета «Комуніст», калгаснікі Бабруйшчыны дзейсна рыхтуюцца да сустрэчы Першага мая. Многія калгаснікі с.-г. арцелі «Чырвоная Бярэзіна» ў гэтым годзе пабудавалі сабе новыя хаты, абсталявалі іх мэблій. Да свята калгаснікі купляюць новую вопратку абутак. Вядомая стаханаўка калгаса т. Чарнецкая, якая раней купіла палто за 800 рублёў, да першамайскага свята купіла сабе шафу за 200 руб. і самавар за 180 рублёў.

У апошнія дні ўзмоцнена працуюць самадзейныя гурткі калгаса. Хор рыхтуе новыя песні. Асабліва актыўны ўзел у хоры прымае 60-гадовая калгасніца Бацуня Аўдоцця. Да свята рыхтуецца і калгасны струнны аркестр.

МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ КАЛОН

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). На ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах горада палітбасветчыкі правозяць гутаркі аб міжнародным свяце пролетарскай салідарнасці 1-е Мая.

Першамайскія калоны дэманстрантаў будуць па-мастацку афармлены. Калона завода імя Кірава афармляецца на тэму аб іспанскім. Шклозавод афармленнем сваёй калоны пакажа, што «сіле ад іх не залежыць», лесатэхнічны інстытут—«права на адукацыю» і т. д.

Актыўна рыхтуюцца да свята і часці гарнізона, якія на параде прадэманструюць сваю баявую гатоўнасць да абароны шчаслівага жыцця совецкага народу.

ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў КАЛГАСАХ

У калгасах «Першамайск» і імя Красіна (Уздзенскі раён) і ў калгасе «Чырвоны Окцябр» (Смалявіцкі раён) заканчваецца пабудова новых дробных гідраэлектрастанцый. У маі яны ўступяць у эксплаатацыю. Гідраэлектрастанцыі ладуць энергію для гаспадарчых патрэб і для асвятлення дамоў калгаснікаў.

СУСТРЭЧА БУДУЧЫХ ЛЕЙТЭНАНТАЎ З МОЛАДДЗЮ СТАЛІЦЫ БССР

У Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адбылася сустрэча курсантаў менскага ваеннага вучылішча імя Калініна з моладдзю прадпрыемстваў і навучальных устаноў сталіцы БССР. Вечар быў арганізован камандаваннем ваеннага вучылішча, гаркомам ЛКСМБ і ваенкаматам для азнаямлення моладзі з жыццём, вучобай курсантаў і ўмовамі прыёму ў ваеннае вучылішча.

Вечар адкрыўся дакладам начальніка ваеннага вучылішча імя Калініна камбрыга т. Алёхіна.

Курсант Курыльчык расказаў аб быце і вучобе будучых лейтэнантаў.

Ад імя сабраўшыхся выступіў студэнт гістарычнага факультэта Педагагічнага інстытута т. Ушкоў, які падаў заяву аб прыёме ў ваеннае вучылішча. Таз. Ушкоў—комсамолец, сын удзельніка грамадзянскай вайны, начальніка штаба брыгады.

У канцы вечара курсанты ваеннага вучылішча і жонкі начальніцкага складу дэманстравалі свае поспехі ў мастацкай самадзейнасці.

ЭДЭЛЬМАН.

СКОРАСНЫЯ АЎТАГОНКІ МЕНСК—КІЕЎ

28 красавіка ў 5 гадзін раніцы ў Менску і Кіеве адначасова даюцца старты сустрэчным скорасным аўтапрабегам па маршрутах Менск — Кіеў і Кіеў — Менск. У гонках прымаюць удзел па 5 легкавых аўтамашын маркі «ГАЗ-А» з кожнага боку. Машыны ідуць з адкрытымі вярхамі, без пасажыраў, у кожнай — па два вадзіцелі. Маршрут — безупынкавы. Гаручым машыны заправяляцца на ходу.

У мінулым годзе пераможцам у гонках па гэтых-жа маршрутах вышла каманда кіеўскіх аўтаспартсменаў. Лепшы результат паказаў лейтэнант т. Сцяпанаў (Кіеў), які прайшоў усю дыстанцыю — 564 кілометры—за 6 гадзін 50 мінут з сярэдняй хуткасцю 81,3 кілометра ў гадзіну. Менскія гоншчыкі тт. Прыбыткоўскі і Саламонаў (гараж СНК БССР) паказалі час 7 гадзін 22 мінуты, робячы ў сярэднім 77,1 кілометра ў гадзіну.

У склад менскай каманды ўваходзяць удзельнікі мінулагодняга аўтапрабегу тт. Прыбыткоўскі, Саламонаў, Вальковіч, Шішкевіч, пераможца 50-кілометравых аўтагонак Шыркевіч і інш.

ЗЛОЎЖЫВАННІ НА НАФТАБАЗЕ

Крымінальным вышукам БССР скончана следства па справе групы работнікаў менскай нафтабазы № 1, якая займалася раскрадваннем і прысваеннем дзяржаўных грошай. На базе не выконвалася распараджэнне Саюзнафтазбыта аб абавязковай нумарацыі рахункаў пры водпуску нафтатавараў, што давала магчымасць касірам Шыловічу, Лахавай, Байдак, рахункаводу Пілецкаму сістэматычна прысвойваць грошы. Каб утоіць злачынствы, яны падрабялялі дакументы, падпісваючы іх выдуманымі прозвішчамі.

Рэвізіяй устаноўлена нястача на базе 11,5 тоны бензіна, 43 тоны газы, 11 тон аўтолу і інш. на суму 44.987 руб.

Кіраўнікі базы Іткін і Захараў, замест таго, каб выкрыць злачынцаў, п'янствавалі з імі і самі прысвайвалі маемасць базы (боты, веласіпед і т. д.).

Да судовай адказнасці прыцягваецца 9 чалавек: З. Я. Іткін, І. Д. Захараў, С. Г. Шыловіч, К. П. Лахава, І. Б. Байдак, П. Б. Пілецкі і інш.

І. МІН.

ЗДАРЭННІ

Сімуляцыя абрабавання. У віцебскае гарадское аддзяленне міліцыі прышоў загадчык крамы № 4 міхалеўскага сельпо Бяроза, які заявіў, што невядомыя арабілі напад на краму, абрабавалі яе і нанеслі яму пабоі.

Пры праверцы аказалася, што Бяроза сімуліраваў абрабаванне з мэтай захаваць растрату звыш 2000 рублёў каператыўных грошай. Ён сам нанёс сабе параненні.

Сімулянт арыштаван і прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

МІЛЬЁН РУБЛЁЎ НА ДАПАМОГУ ДЗЕЦЯМ

Цэнтральная камісія дапамогі дзецям пры ЦВК БССР за мінулы год выдаткавала звыш мільёна рублёў на аказанне розных відаў дапамогі дзецям, галоўным чынам, выхаванцам дзіцячых домоў. У гэту суму ўваходзіць каля 300 тыс. рублёў, адпушчаных на курортную дапамогу, пазашкольную масавую работу і т. д.

Камісія адпусціла 81 тыс. рублёў на правядзенне летняй аздараўленчай кампаніі сярод выхаванцаў дзіцячых домоў у бягучым годзе. Ужо закуплена курортных путёвак на 20 тыс. рублёў. Першая група з 7 дзяцей выязджае гэтымі днямі ў Одэсу, на Люндорфскі курорт.

РАБОТА ЛАЗНЯЎ

Усе лазні Менска, апрача Серабранскай, 28 і 29 красавіка будуць працаваць круглыя суткі. 30 красавіка — да 2 гадз. ночы. Серабранская лазня да 30 красавіка працуе да 2 гадз. ночы.

АД ПАРТКАЛЕГІІ ПРЫ УП. КПК ПА БССР

Партканегія пры Ўпаўнаважаным КПК па БССР просіць гр. Палцера Хаца Марковіча з'явіцца ў ПК (Менск, Чырвонаармейская, 16, 3 паверх, пакой 27) або паведаміць свой адрас.

Просьба да ўсіх устаноў і асоб, ведаючых месцазнаходжанне Палцера Х. М. паведаміць Парткалегіі.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Сход комсамольскага актыва Варашылаўскага РК ЛКСМБ сумесна з комсамольскімі арганізацыямі воінскіх частей адбудзецца 28 красавіка, у 7 гадзін 30 мінут вечара, у памяшканні Дзіцячага кіно. Парадак дня: 1. Даклад тав. Косенжука на тэму: Задачы комсамола ў галіне антырэлігійнай прапаганды. 2. Мастацкая частка.

Білеты ў РК ЛКСМБ.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
27 красавіка Абан. № 94
ПЛАТОН КРЭЧЭТ

Памяшк. Дзярж. Ярэйск. театра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
28 красавіка Абан. № 25
РЫГАЛЕТО

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» «ЧУДЕСНИЦА»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» НАЗАР СТАДОЛЯ

Дзіцячы гукавы кінотэатр ЗВОРНАЯ ПРАГРАМА

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

Гукавы кінотэатр «Спартак» ІЎДУШКА ГАЛАЎЛЕЎ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 27 КРАСАВІКА:
8.30 — «Апошнія паведамленні». 16 — канцерт — урыўкі з оперы «Гуно». 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — заўчорная партвучоба. 19.45 — мантаж оперы Дзержынскага «Ціхі Дон». 21.05 — развучванне песень да Першага мая. 22 — канцерт мастацкай самадзейнасці. 23 — «Апошнія паведамленні», 23.15 — перадача на польскай мове.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 28 КРАСАВІКА:
8.30 — «Апошнія паведамленні». 16 — канцерт. 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — заўчорная партвучоба. 19.45 — канцерт. 23 — «Апошнія паведамленні».

ДА ВЕДАМА

ПАДПІСЧЫКАЎ НА ПАЗЫКУ „ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ" (ВЫПУСК 4 ГОДА)

КІРАЎНІКОЎ і ГАЛОЎНЫХ БУХГАЛТАРОЎ

ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ І СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ

У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ красавіка месяца 1937 года, павінны быць праведзены разлікі па калектыўнай падпісцы рабочых і служачых на пазыку «Другой пяцігодкі» (выпуска чацвертага года).

ПАДПІСЧЫКАМ павінны быць выданы разліковымі аддзеламі прадпрыемстваў і ўстаноў аблігацыі на ўсю суму ўплочаных узносаў.

БУХГАЛТЭРЫІ прадпрыемстваў і ўстаноў і старшыні сельсоветаў павінны выверыць разлікі па калектыўнай падпісцы на пазыку з кожным асобным падпісчыкам і забяспечыць выверку і поўнае завяршэнне разлікаў з адпаведнай ашчадкасай.

ЗА ЗРЫЎ РАЗДАЧЫ аблігацый да першага тыражу выйгрышаў па пазыцы «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) і за пазбаўленне падпісчыкаў магчымасці прымаць удзел у тыражы ў сувязі з затрыманай ліквідацыі запазычанасці, кіраўнікі і галоўныя бухгалтары прадпрыемстваў і ўстаноў і старшыні сельсоветаў нясуць персанальную адказнасць.

АБЛІГАЦЫІ, якія па якіх-небудзь прычынах не будуць атрыманы падпісчыкамі, павінны быць аданы ў цэнтральныя і раённыя ашчадкасы на захаванне ў абязлічаным відзе.

ПАДПІСЧЫКІ, якія не атрымаюць аблігацыі, змогуць атрымаць аблігацыі на суму падпіскі в цэнтральных і раённых ашчадкас толькі да 1 чэрвеня 1938 г. З гэтага тэрміну падпісчыкі трацяць права на атрыманне аблігацый.

КАМСОДЫ абавязаны праверыць раздачу аплочаных аблігацый на рукі падпісчыкам, а таксама прычыну неўручэння аблігацый падпісчыкам.

ПАДПІСЧЫКІ НА ПАЗЫКУ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА), ПАТРАБУЮЦЬ АД РАЗЛІКОВЫХ АДДЗЕЛАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ І СЕЛЬСОВЕТАЎ АПЛОЧАНЫЯ АБЛІГАЦЫІ ПА ПАДПІСЦЫ 1936 г.

АБМЕНЬВАЮЦЬ ў сувязі з канверсіяй свае аблігацыі раней выпушчаных дзяржаўных унутраных пазык на аблігацыі пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года).

ТРЫМАЛЬНІКІ ДЗЯРЖПАЗЫК, ЯКІЯ ЗДАЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАД ССУДЫ І НЕ ПАГАСЯЦЬ ССУДЫ ДА ПАЧАТКУ ТЫРАЖУ, ПАЗБАЎЛЯЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ТЫРАЖАХ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ЗАКЛАДЗЕНЫХ ІМІ АБЛІГАЦЫЯХ ДЗЯРЖПАЗЫК.

ДА ПЕРШАГА ТЫРАЖА ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (выпуск чацвертага года) НІ АДНОЙ НЕРАЗДАНАЙ І НЕ АБМЕНЕНАЙ АБЛІГАЦЫІ!

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

Беларускай канторы «Сельгаснабжэнне»
ПАТРАБУЕЦЦА ІНЖЫНЕР-МЕХАНІК па мантажу
і ўстаноўцы ветрарухавікоў.
Звяртацца па адрасу: Менск, Совецкая, 46, тэлефон № 23-714.

У ПАСЯДЖЭННІ ВУЧОНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА
адбудзецца ПУБЛІЧНАЯ АБАРОНА
ДЫСЕРТАЦЫЙ
НА АТРЫМАННЕ ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ КАНДЫДАТА НАВУК:
29 красавіка — І. Д. ЕФРАШКІН. ТЭМА: «САРТАВАННЕ ІЛЬНАСЕМЯ ПА ЎЛАСЦІВАСЦІ П АВЕРХНІ».
Апаненты: член-карэспандэнт АН БССР, доктар тэхнічных навук, праф. Ю. А. ВЕЙС і дацэнт А. І. ЛАПО.
5 мая — В. Н. КАПУЦІН. ТЭМА: «ДАСЛЕДВАННЕ ЯКАСЦІ РАБОТЫ ПАЎДНЕВАГА І ПАЎНОЧНАГА КАМБАЙНАЎ У БССР».
Апаненты: праф. Ю. А. ВЕЙС і дацэнт К. Г. ЛУТАРСКОЙ.
8 мая — С. С. ЗАХАРАЎ. ТЭМА: «УПЛЫЎ ПАСЛЯДЗЕННЯ ВАПНЫ НА ЯКАСЦЬ УРАДЖАЮ ІЛЬНУ І КАНЮШЫНЫ».
Апаненты: акад. О. К. КЕРДРАЎ-ЗІХМАН, праф. А. Г. МЯДЗВЕДЗЕЎ і праф. І. С. ЛУПІНОВІЧ.
10 мая — А. І. РЫЖАНКОЎ. ТЭМА: «ДАСЛЕДВАННЕ РАБОТ ПІРОКАЗАХВАТНЫХ ІЛЬН ОЦЕРАБІЛАК ВНІІЛ І ДАРОНІНА».
Апанент праф. Ю. А. ВЕЙС.
ДЫСЕРТАЦЫІ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІНСТЫТУТА.

НАРКОМХАРЧПРОМ БССР
МЕНСКІ МАЛОЧНЫ КАМБІНАТ
Маскоўская, 22.
ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ
значна павялічыў асартымент
МАРОЖАНАГА
У продажы ёсць:
ЭСКІМО ў шакаладзе,
АРКТЫКА, БРЫКЕТЫ,
ТАРТЫ з марожанага,
марожанае ў разваж.
Прымаюцца папярэднія заказы.
За ўсімі даведкамі звяніць па тэлефонах №№ 22-303, 20-908.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Менскі піваварны завод „БЕЛАРУСЬ"
(Старажоўская, 44, тэл. 21-749 і 21-751)
выпускае ў продаж
ПІВА
ВЫШЭЙШАЙ ЯКАСЦІ,
ВЫРАБЛЯЕМАЕ З НАЙЛЕПШАЙ АДБОРНАЙ СЫРАВІНЫ ПА НОВАЙ, ЗАЦВЕРДЖАНАЙ НКМП БССР РЭЦЭПТУРЫ:
УКРАІНСКАЕ
ЖЫГУЛЕЎСКАЕ
РУСКАЕ
ПОРТЭР
ЧОРНАЕ
ВОДЫ
ФРУКТОВА-ЯГАДНЫЯ НАПІТКІ
З НАТУРАЛЬНЫХ СОКАЎ НА ЧЫСТЫМ ЦУКРУ, ПАВЫШАНАЙ ЯКАСЦІ:
КРЗМ-СОДА
ВІШНЕВЫ
ЛІМОННЫ
ТЗАТРАЛЬНЫ
МАЛІНАВЫ
КЛЮКВЕНЫ
КРУШОН
СІТРО
ХЛЕБНЫ КВАС
І МОРС
КЛЮКВЕНЫ ЯБАЧНЫ

ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ
ТРАЎ КАНЮШЫНЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР І КВЕТАК
МОРКВА КАПУСТА БУРАКІ ПАМІДОРЫ АГУРКІ
МЕНСКАЯ БАЗА ДЗЯРЖСОРТФОНДА
(г. Менск, Ковырава, Германаўская вуліца, дом № 1)
ПРАДАЕ праз свае ЛАРКІ
ПРОДАЖ праводзіцца без абмежавання УСІМ па дзяржаўных цэнах
У МЕНСКУ (на рынках — Крытым, Чэрвенскім, плошчы 25 Кастрычніка, Суражскім і Конным базары),
У ВІЦЕБСКУ (Чырвонаармейская, 23) і
У ПОЛАЦКУ
АБ ЦЭНАХ на насенне можна даведацца таксама і па тэл. 20-972.
К ПРАДСТАЎЧАМУ КАЛГАСНАМУ КІРМАШУ — З 25 ПА 30 КРАСАВІКА ЛАРКІ ПАПАЎНЯЮЦЦА АСАРТЫМЕНТАМ УСЯГО НАСЕННЯ.

ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ
У МАГАЗІНЫ „ГАСТРАНОМ" і „БАКАЛЕЯ"
пастуцілі вялікія парты тавараў
КАЎБАСА ўсіх гатункаў. ВЕТЧЫНА.
РЫБАПРАДУКТЫ, КАНСЕРВЫ, СЕЛЯДЦЫ.
МАСЛА, СЫРЫ.
МУКА, КРУПЫ, ЦУКАР, ЧАЙ, КОФЕ.
КАНФЕТЫ, ПЯЧЭННЕ, ВАРЭННЕ, ШАКАЛАД, КАКАО.
ТАРТЫ, КЕКСЫ, БАБКІ, ПІРОЖНЫЯ (улясн. выраб).
Лепшы выбар ВІН, ТАБАЧНЫХ вырабаў.
Дзіцячыя першамайскія подарункі
Усе магазіны прымаюць заказы з ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ.
Карыстайцеся паслугамі СТАЛА ЗАКАЗАЎ.
НЕ ТРАЦЦЕ ЧАСУ капля прыпаўкаў і кас.
Прымаюцца заказы для ВЕЧАРОЎ.
Усе магазіны з 15 красавіка павялічылі час работы на 2 гадзіны
ЗАПОМНІЦЕ АДРАСЫ НАШЫХ МАГАЗІНАЎ:
МАГАЗІН № 1 — Совецкая, 66 (супроць ГУМ'а), тэл. 21-251.
МАГАЗІН № 2 — Совецкая, 24 (супроць Дома ўрада), тэл. 24-907.
МАГАЗІН № 3 — Ленінская.
МАГАЗІН № 4 — Ленінская, 36, тэл. 24-652.
МАГАЗІН № 14 — Гарбарная.
МАГАЗІН № 15 — Ленінская, 10, тэл. 20-994.
МАГАЗІН № 16 — Маскоўская, тэл. 21-621.
Магазіны «ГАСТРАНОМ» і «БАКАЛЕЯ» існуюць таксама ў гарадах Віцебску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску.
ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛ. АДДЗ. «СОЮЗПРОДМАГА».

Уп. Галоўлітбела № К—2073. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.